Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 СТУДЗЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 7 (28371)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Рысь папрасіла дапамогі... у чалавека**

СТАР. 3

Сямейная газета



**Бясплатная спа-працэдура ці ашуканства?**



**Зімовыя парады ад доктара Вітушкі**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый МІРОНЧЫК, начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС:**

*«Міністэрства замежных спраў канстатуе высокую цікавасць замежных грамадзян да бязвізавага ўезду ў Беларусь. Спецыяльна, каб адказаць на пытанні максімальна шырокай аўдыторыі, МЗС упершыню правёў консульскі дзень у сацсетках. У выніку аўдыторыя, якая азнаёмілася з паведамленнямі аб новым рэжыме ўезду ў Беларусь і атрымала адказы на пытанні, звязаныя з наведваннем нашай краіны, перавысіла 1 млн чалавек з шырокага кола краін».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9697 | ▲ |
| Еўра | 2,0803 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0723 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# «ЗДАРОЎ, СКРЫПУЧЫ МЯККІ СНЕГ!»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На зімовай горцы юныя мінчанкі Яна КАЗЛОВА, Ясенія ОЛЬКІНА, Дар'я РУДЗЬКО.

■ Спажывецкі кошык

# АНТЫПРАДУКТЫ,

## або Як не трапіць на вудачку «хітрай» ежы

**Так цяжка супрацьстаяць дзіцячаму «хачу», калі стаіш з малым каля касы, а пад носам безліч прынад для самых юных спажыўцоў. Яскравыя ўпакоўкі з мульцяшнымі героямі, ласункі з сюрпрызамі для хлопчыкаў ды дзяўчынак і... надпісы дробным шрыфтам з доўгім пералікам розных дабавак, якія выкарыстоўваліся ў вытворчасці такой прадукцыі. Нават у складзе тых жа кукурузных палачак можна знайсці і «скандальны» пальмавы алей, і ўзмацняльнікі смаку... Уласна, у большасці сваёй уся гэтая салодкая драбяза — зусім не дзіцячая ежа. Больш за тое — шкодная.**

### Салодкае жыццё?



— Канешне, цукар — самая вялікая праблема. Ён так даўно выкарыстоўваецца, што здаецца, быццам гэта бяскрыўдная рэч, — заўважае **начальнік аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні Валерый ШЫЛАЎ.** — З яго ўжываннем звязана многа хвароб: атлусценне, запаленне артэрыяльных сасудаў, захворванні печані і нырак, нават анкалогія. Мала хто задумваецца аб тым, колькі наогул цукру мы атрымліваем з прадуктамі. Напрыклад, толькі ў адной бутэльцы з газіраваным напоем яго 5 сталовых лыжак...

***— Але ўжо вырасла пакаленне, якое не ўяўляе свайго жыцця без падобнай прадукцыі. Нясмачны (лічы, «несалодкі») тавар складана прадаць.***

— У тым і бяда, што дрэнныя звычкі прывіваюцца з дзяцінства. Прыродай, наогул, у нас патрэба ў цукры не закладзена. Гэта ж не традыцыйны прадукт — цукровай прамысловасці максімум 200 гадоў. Яшчэ адна праблема — рафінаваныя вугляводы. У іх адсутнічаюць харчовыя валокны, што ўплывае на рост патагенных кішэчных бактэрый. Адсюль рызыка развіцця атлусцення і запаленчых захворванняў кішэчніка.

СТАР. 4

■ Нерухомасць

# ЖЫЛЛЁВЫ КВАДРАТ ДА ЛЕТА МОЖА «СХУДНЕЦЬ» ЯШЧЭ НА 10%

## Аднак спецыялісты не выключаюць, што ўжо ў ліпені-жніўні сітуацыя з цэнамі можа кардынальна змяніцца і жыллё пачне... нават даражэць

**Аналітыкі жыллёвай сферы адзначаюць, што мінулы год для другаснага рынку жылля стаў даволі ўдалым. Пасля працяглага зацішша менавіта летась пакупнікі пачалі актыўна набываць у Мінску кватэры. А ў выніку ў сталіцы за 2016 год было зафіксавана крыху больш за 15 тысяч здзелак куплі-продажу жыллёвай нерухомасці, што з'яўляецца рэкордам за апошнія 5 гадоў. Напрыклад, у 2014 і 2015 гадах фіксавалася толькі каля 13 тысяч падобных здзелак. Каб прафесійна ацаніць сітуацыю на мінскім рынку жылля і скласці прагноз на бліжэйшыя 6—8 месяцаў, карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з вядомым экспертам у сферы жыллёвай нерухомасці — старшынёй савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» (БелАН) Мікалаем ПРАСТАЛУПАВЫМ.**

### Маленькія аднапакаёўкі — каля 35 тысяч долараў

Зразумела, што гэта мінімальны кошт самых «слабенькіх» і малых па плошчы аднапакаёвых кватэр. Па такім цэнніку прапануюцца кватэры з агульнай плошчай да 35 квадратных метраў у старых пяціпавярховых дамах на крайніх паверхах. Крыху лепшае жыллё ў стандартных дзевяціпавярховых панэльках выстаўляецца на продаж ужо за 42—45 тысяч долараў. Сапраўды прасторныя аднапакаёўкі з палепшанай планіроўкай у дастаткова маладых дамах спальных раёнаў могуць прапанавацца нават і цяпер па цане да 60 тысяч долараў.

Самыя танныя двухпакаёвыя кватэры маюць цэннік ад 36 да 42 тысяч долараў. Плошча такога бюджэтнага жылля звычайна складае ад 45 да 49 квадратных метраў. Кватэры гэтага цанавога ўзроўню будуць абавязкова мець вельмі маленькую кухню (да 6 «квадратаў») і прапіску ў не самым прэстыжным раёне сталіцы, напрыклад у Заводскім. Стандартныя двухпакаёвыя кватэры з агульнай плошчай да 50—52 квадратных метраў прапануюцца цяпер за 45—55 тысяч долараў. Сучасныя двухпакаёўкі з прасторнымі кухнямі і агульнай плошчай да 70 квадратных метраў выстаўляюцца на продаж ужо па цане ад 65 да 75 тысяч долараў і нават даражэй.

СТАР. 2

■ Ва ўрадзе

# Магчымасці «беларускага шоўку»

**Выкарыстанне патэнцыялу льняной галіны можа ўнесці істотны ўклад у эканоміку. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, на якім разглядаліся пытанні выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы і ўрада па павышэнні эфектыўнасці вырошчвання льну, вытворчасці і перапрацоўкі льновалакна, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

Паводле слоў Андрэя Кабякова, Беларусь была і застаецца адной з вядучых краін — вытворцаў ільновалакна. Да аб'ектыўных канкурэнтных пераваг адносяцца і спрыяльныя прыродна-кліматычныя ўмовы для вырошчвання льну. На яго думку, выкарыстанне патэнцыялу льнянога падкомплексу можа ўнесці істотны ўклад у эканоміку краіны за кошт усё большага попыту на льняную прадукцыю на знешнім рынку.

Кіраўнік урада таксама адзначыў, што для павышэння эфектыўнасці першаснай перапрацоўкі льну ў рэспубліцы праведзена мадэрнізацыя арганізацый ільняной галіны шляхам набыцця сучаснага высокапрадукцыйнага абсталявання. У 2016 годзе льнотрасту перапрацоўвалі 29 ільнозаводаў, на якіх устаноўлены 54 тэхналагічныя лініі выпрацоўкі льновалакна, у тым ліку 10 высокапрадукцыйных.

Асноўныя задачы, якія цяпер вырашаюцца ў ільняным падкомплексе, — павышэнне якасці льновалакна з адначасовым зніжэннем яго сабекошту, а таксама павелічэнне глыбіні перапрацоўкі льновалакна з выхадам на гатовыя вырабы з высокай дабаўленай вартасцю, адзначыў прэм'ер-міністр.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Партнёры

# ЛЕКІ З КАРЫБАЎ

## Кубінскі прэпарат супраць дыябету пачаў прымяняцца ў нашых бальніцах

**Сёлета Беларусь і Куба могуць выйсці на якасна новы ўзровень двухбаковага супрацоўніцтва. Пра гэта заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь Херарда Суарэс АЛЬВАРЭС.**

Пасол звярнуў увагу, што Беларусь актыўна супрацоўнічае з Кубай у сферы аховы здароўя. Пасля паспяхова праведзеных у Мінску клінічных выпрабаванняў кубінскага прэпарата супраць сіндрому дыябетычнай ступні «Эберпрот-П», які не мае аналагаў у свеце, ён стаў прымяняцца для лячэння пацыентаў у беларускіх бальніцах на нацыянальным узроўні. Акрамя таго, кубінскі бок экспартуе ў нашу краіну іншую біятэхналагічную прадукцыю — напрыклад, вакцыну супраць гепатыту Б.

На думку кубінскага дыпламата, у 2017 годзе, акрамя работы ў дзеючых напрамках, неабходна заняцца паглыбленнем і пашырэннем двухбаковага парадку дня, які закране праекты ў іншых галінах, такіх як прамысловасць, сельская гаспадарка і навука. Па словах спадара Херарда Суарэса Альварэса, навука і тэхналогіі — менавіта тая вобласць, у якой мы можам умацаваць наша супрацоўніцтва, прымаючы пад увагу той факт, што 2017 год у Беларусі абвешчаны Годам навукі.

«Мы лічым, што створаны ўсе ўмовы для якаснага пераходу на новы ўзровень у нашых двухбаковых адносінах, — падкрэсліў Херарда Суарэс Альварэс. — І мы зможам найлепшым чынам выкарыстаць усе існуючыя магчымасці ў рамках выдатнай палітычнай волі абодвух урадаў».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

## СУБОТА — ДЗЕНЬ ПРАМЫХ ЗВАРОТАЎ

**Традыцыйныя стасункі жыхароў краіны з кіраўніцтвам рэгіёнаў аднаўляюць сваю работу пасля навагодніх свят. 14 студзеня 2017 года, як заўсёды з 9.00 да 12.00, на сувязі з беларусамі будуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
КЛЕЦ Андрэй Анатольевіч — намеснік старшыні (80162213121);
**Віцебскі аблвыканкам**
МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч — намеснік старшыні (80212222222);
**Гомельскі аблвыканкам**
ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч — намеснік старшыні (80232751237);
**Гродзенскі аблвыканкам**
ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч — намеснік старшыні (80152735644);
**Магілёўскі аблвыканкам**
ВАРОНІН Рыгор Аляксандравіч — кіраўнік спраў (80222501869);
**Мінскі аблвыканкам**
МАКАР Ігар Мікалаевіч — першы намеснік старшыні (80175004160);
**Мінскі гарвыканкам**
ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч — намеснік старшыні (80172224444).

■ Блізкая ўлада

# Конь і брычка ў падарунак

## Як падымалі сельскую гаспадарку ветэраны Міншчыны

**Старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА сустрэўся з ветэранамі сельгасвытворчасці цэнтральнага рэгіёна. Два гады таму такія сустрэчы вырашана было зрабіць традыцыйнымі. І вось паважаныя людзі Міншчыны — былыя кіраўнікі раёнаў, калгасаў, жывёлаводы, механізатары, спецыялісты — сабраліся ў гарналыжным комплексе «Сілічы» трэці раз. Такія мерапрыемствы — добрая нагода для былых калег сабрацца разам, згадаць гады сумеснай працы, поспехі, а то і няўдачы і проста пабачыцца адзін з адным.**

— Гэтыя сустрэчы даюць магчымасць яшчэ раз аддзячыць вам за нялёгкую працу на зямлі і вернасць сваёй прафесіі, — падкрэсліў Сямён Шапіра. — Мы расцэньваем іх, як своеасаблівую справаздачу пра тое, як развіваецца Мінская вобласць, якіх поспехаў дасягнулі аграрыі, якія праблемы неабходна сёння вырашаць, каб рухацца далей.

Ветэранам, якія лепшыя гады свайго жыцця аддалі Міншчыне, сапраўды неабыякава было пачуць аб стане спраў у рэгіёне, аб тых падзеях, што адбываюцца тут. А яшчэ, як прызнаваліся многія, прыемна, што пра іх помняць, з павагай ставяцца да іх працоўных заслуг.

— Мінская вобласць сёлета, як і мінулыя гады, унесла дастойны ўклад у харчовую бяспеку краіны. Па выніках работы за 11 месяцаў тэмп росту вытворчасці валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі склаў 105%. На працягу апошняга дзесяцігоддзя рэгіён трывала трымае рэпутацыю галоўнай жытніцы краіны. У мінулым годзе ў засекі краіны з палёў Міншчыны паступіла чвэрць валавога збору рэспублікі. Сёння ў Мінскай вобласці выпускаецца каля 15% усёй прамысловай прадукцыі краіны і 25% сельскагаспадарчай. Кожны пяты квадратны метр жылля, якое ўводзіцца ў дзеянне ў Беларусі, пабудаваны ў нашай вобласці, — канстатаваў старшыня аблвыканкама.

Канешне, за некалькі гадзін, што працягвалася сустрэча, нельга расказаць пра кожнага з 280 ветэранаў, якія сабраліся ў зале. Яшчэ кіраўнік цэнтральнага рэгіёна згадаў пра тых, чые імёны ў свой час былі вядомыя не толькі ў роднай Беларусі, але і ў Савецкім Саюзе.

У васямнаццаць гадоў Тамаш Дзятко пайшоў на фронт, быў цяжка паранены. Вярнуўся дадому ў студзені 1945-га з двума баявымі ордэнамі — Айчыннай вайны I і II ступеняў. А ў красавіку, калі яшчэ ішла вайна, сабраў жанчын і сказаў самую кароткую прамову ў сваім жыцці: «Вашы мужы і сыны перамаглі ворага-фашыста. А мы з вамі павінны перамагчы іншага ворага — голад і разруху». Так пачалася працоўная біяграфія 23-гадовага франтавіка, у брыгадзе якога былі толькі адны жанчыны і падлеткі. Працаваць даводзілася шмат і цяжка. А хутка прыйшоў і поспех.

У 1972 годзе ў калгас «Маяк» Барысаўскага раёна прыехаў першы сакратар ЦК КПБ Пётр Міронавіч Машэраў, каб асабіста павіншаваць з працоўнай перамогай Тамаша Антонавіча і яго брыгаду. Яны атрымалі небывалы па тых часах для Беларусі ўраджай пшаніцы «міронаўская-80»: на круг па 56 цэнтнераў, амаль у чатыры разы больш за сярэднерэспубліканскі паказчык.

Больш як 40 гадоў ён працаваў брыгадзірам, намеснікам старшыні ў адной і той жа гаспадарцы. Да баявых узнагарод дадаліся высокія ўзнагароды за працу: ордэны Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга і Кастрычніцкай рэвалюцыі, пяць залатых і сярэбраных медалёў ВДНГ. Хутка Тамаш Антонавіч будзе сустракаць свой 93-і дзень нараджэння.

Сорак два гады запар кожную раніцу Аліна Іосіфаўна Лагацкая запрагала кагаснага каня і цэлы дзень на гэтым няхітрым, але надзейным транспарце аб'язджала свой вытворчы ўчастак. Дзесяць гадоў таму яна выйшла на пенсію, але працягвае працаваць у той жа гаспадарцы, дзе пачынала сваю дзейнасць, — у адкрытым акцыянерным таварыстве "Кастрычніцкая рэвалюцыя" Дзяржынскага раёна. Калі яе праводзілі на пенсію — сярод іншых падарункаў аднагалосна рашэннем праўлення жанчыне ўручылі і незвычайны — каня з брычкай.

У былога старшыні калгаса «Цімкавічы» Капыльскага раёна Віктара Коласа сярод некалькіх узнагарод ёсць рэдкая — Залаты медаль імя Мікалая Вавілава — за заслугі ў галіне раслінаводства і селекцыі.

Мікалай Васілевіч у 1976 годзе ўзначаліў адну з самых адсталых гаспадарак Слуцкага раёна — калгас «Ленінскі шлях» і за некалькі гадоў зрабіў яго адным з лепшых не толькі ў Беларусі, але і ў былым Савецкім Саюзе.

У калгасным музеі Працоўнай славы беражліва захоўваецца памятны знак «Рубінавая зорка», якім гаспадарка ўзнагароджана за высокую эфектыўнасць работы па выніках X і XI пяцігодак. Калгас быў занесены на Дошку гонару ВДНГ СССР.

Дадам, што сустрэчы з ветэранамі сельгасвытворчасці ладзяцца толькі ў Мінскай вобласці.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# ...КВАДРАТ ДА ЛЕТА МОЖА «СХУДНЕЦЬ»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Найбольш за апошнія тры тыдні ў Мінску патаннелі трохпакаёвыя кватэры. У старых дамах на крайніх паверхах сёння магчыма набыць такое жыллё плошчай да 55—58 квадратных метраў па цэнніку ў межах ад 48 да 55 тысяч долараў. Толькі за першы тыдзень новага года квадратны метр трохпакаёвых кватэр патаннеў адразу на 15 долараў. Самы масавы цэннік трохпакаёвых кватэр сярэдніх плошчаў знаходзіцца ў дыяпазоне ад 65 да 85 тысяч долараў.

### Старое жыллё таннее хутчэй

Цяпер на рынку ўзнікае ўпэўненая тэндэнцыя патанення стандартных кватэр менавіта ў пяціпавярховых дамах старых серый, якія не дачакаліся цеплавой рэабілітацыі. Узровень аплаты жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП) у гэтых дамах ужо сёння часам істотна адрозніваецца ад больш новых серый. Акрамя таго, прадаўцы і пакупнікі разумеюць, што сёлетняе павелічэнне тарыфаў ЖКП не апошняе. Было аб'яўлена, што ўжо праз год жыхары шматпакаёвак пачнуць аплачваць паслугі камунальшчыкаў на 100%, у тым ліку і па ацяпленню. Таму ўласнікі падобнага жылля пры продажы такога «неліквіду» часам згаджаюцца на даволі істотныя зніжкі. А вось попыт на яго менавіта зімой сёлета мінімальны.

Акрамя таго, цяпер на другасным рынку жылля сталіцы больш упэўнена таннеюць кватэры вялікіх плошчаў. Справа ў тым, што за мінулыя 8—9 месяцаў на рынку актыўна набываліся выключна танныя кватэры. Такія кватэры былі часткова павымываны з рынку, а ў выніку прапанова аднапакаёвых кватэр цяпер істотна скарацілася. Але гэта не значыць, што маленькія кватэры хутка пачнуць даражэць, бо іх мала. Мікалай Прасталупаў лічыць, што цяпер на рынку не хапае кліентаў з сур'ёзнымі грашыма, якія маглі б ажыццяўляць чыстую куплю (без папярэдняга продажу сваёй кватэры) двухпакаёвых і трохпакаёвых кватэр вялікай плошчы. Попыт на падобнае жыллё сёння мінімальны, таму яно і будзе таннець у першую чаргу.

### Гэты зменлівы рынак...

Наш эксперт упэўнены, што прыкладна да сярэдзіны лета цэны на кватэры на другасным рынку сталічнага жылля з пачатку года знізяцца на 7—10%. На яго думку, гэта цалкам рэалістычны сцэнарый, бо ў работнікаў большасці сектараў эканомікі працягваюць зніжацца рэальныя даходы. Акрамя таго, сёння ў фінансавага сектара дзяржавы не існуе дастатковага аб'ёму грашовых абаротных сродкаў. Менавіта таму насельніцтву цяпер не прапануюцца і танныя крэдыты на будаўніцтва ці набыццё жылля. А без павелічэння даходаў і даступных крэдытаў попыт на дарагое сталічнае жыллё будзе памяншацца. Таму цэны на яго знізяцца. Аб якіх рэальных лічбах можа ісці гаворка пры аб'яўленым узроўні патанення?

Мікалай Прасталупаў паведаміў, што сёння ў рэальных здзелках тыпавая двухпакаёвая кватэра агульнай плошчай 50 квадратных метраў прадаецца толькі ў тым выпадку, калі квадратны метр такога жылля ацэньваецца прадаўцом на ўзроўні 1050 долараў. Спецыяліст упэўнены, што ўжо летам квадратны метр падобнага жылля будзе мець цэннік не больш за 900—950 долараў. Разам з тым уласнікі кватэр на другасным рынку жылля заўсёды прыглядаліся да цэн, якіяназіраюцца на першасным рынку. А вось тут камерцыйныя забудоўшчыкі працягваюць трымаць учарашнія цэны на новае жыллё. Гэта пры тым, што ў адзначаным сектары попыт на новабудоўлі істотна скараціўся, а ў арганізатараў будаўніцтва «падвісла» на працяглы тэрмін больш чым 500 пустых кватэр. Справа ў тым, што кватэры ў новабудоўлях прадаюцца дынамічна толькі тады, калі квадратны метр у гэтым сектары прыкладна на 50—100 долараў таннейшы, чым на другасным рынку жылля.

Наш суразмоўца паведаміў, што падобную цанавую карэкціроўку летась прадэманстравалі забудоўшчыкі абласных цэнтраў, дзе жыллёвы «квадрат» сёння прапануецца спажыўцам за 550—600 долараў. Гэта пры тым, што ў пачатку мінулага года квадратны метр там ацэньваўся на ўзроўні 800 долараў.

Свой прагноз па рынку нерухомасці Мікалай Прасталупаў вырашыў пабудаваць у тым ліку і праз аналіз геапалітычных тэндэнцый, якія датычацца фінансава-эканамічных перспектыў Расіі. Ужо зразумела, што эканамічныя санкцыі ЗША супраць Расіі да 1 ліпеня захаваюцца, бо іх правяла яшчэ старая адміністрацыя прэзідэнта. Аднак ужо хутка рэальна кіраваць палітыкай гэтай далёкай дзяржавы пачне новы прэзідэнт. У гэтым выпадку можа быць перагледжана фінансавая палітыка ЗША ў адносінах да Расіі. У ідэале, ужо ў ліпені-жніўні Расія можа атрымаць сур'ёзныя крэдытныя рэсурсы, тэхналогіі і аднаўленне сумесных праектаў не толькі з Амерыкай, але і з большасцю краін Заходняй Еўропы. А ўслед за Расіяй пачне падымацца і эканоміка нашай краіны. У гэтым выпадку другасны рынак сталічнага жылля адрэагуе новымі цэнавымі тэндэнцыямі амаль імгненна, лічыць наш эксперт. Спачатку цэны на жыллё стабілізуюцца, а праз пэўны час пачнецца чарговая хваля — ужо на падаражанне.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Жыллё

# СТАЛІЧНЫ РЭГІЁН «ПРЫРАСЦЕ» АМАЛЬ НА МІЛЬЁН $М^2$

## А за бюджэтныя сродкі плануецца ўзводзіць толькі эканамічныя праекты

**Сёлета ў краіне плануецца ўзвесці 3,5 мільёна квадратных метраў жылля. Больш за ўсё будзе пабудавана ў Мінскай вобласці — 972 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы. У сталіцы плануюць узвесці 644 тысячы «квадратаў». А менш за ўсё новых кватэр атрымаюць жыхары Віцебскай вобласці, дзе пабудуюць усяго 251 тысячу квадратных метраў. Спецыялісты падлічылі, што ў найбліжэйшыя два гады ў краіне будзе здадзена каля 7 млн квадратных метраў жылля.**

### Стаўка на шматдзетных

Адпаведнай пастановай урада прадугледжана будаўніцтва ў 2017 годзе жылых дамоў (кватэр) для 4 329 шматдзетных сем'яў. Менавіта гэта катэгорыя насельніцтва сёлета будзе атрымліваць ільготныя крэдыты на будаўніцтва ў першую чаргу. Узвядзенне арэнднага жылля на гэты год плануецца ў аб'ёме 114,62 тысячы квадратных метраў. Праўда, у сталіцы за гэты час разлічваюць здаць толькі каля 7 тысяч «квадратаў» арэнднага жылля. У гарадах-спадарожніках — Жабінцы (Брэсцкая вобласць) і Скідзелі (Гродзенская вобласць) — планавецца пабудаваць адпаведна 4 тысячы і 6,6 тысячы квадратных метра.

Мяркуецца, што крэдытныя рэсурсы банкаў, якія накіроўваюцца сёлета на фінансаванне жыллёвага будаўніцтва (без уліку затрат на інфраструктуру), складуць 245,31 млн рублёў. Аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму сумесна з Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва даручана забяспечыць выкананне заданняў на 2017 год па ўводзе ў эксплуатацыю агульнай плошчы жылых дамоў ва ўстаноўленых аб'ёмах, а таксама па стварэнні зачыну пад праграму жыллёвага будаўніцтва на 2018 год.

### Зборныя домікі для індывідуальнага будаўніцтва

Таксама Саўмін рэкамендуе гэтым структурам прыняць меры па стрымліванні росту кошту будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай і за кошт бюджэтных сродкаў праз механізм выкарыстання праектаў (серый) эканамічных жылых дамоў тыпавых спажывецкіх якасцяў, пералік якіх зацвярджаецца Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва. Пры фарміраванні праграм дзяржаўнага заказу на будаўніцтва (узвядзенне, рэканструкцыю) жылых памяшканняў даручана максімальна ўжываць праекты такіх дамоў у буйнапанэльным выкананні, а таксама аказваць усебаковае садзейнічанне грамадзянам у будаўніцтве індывідуальных жылых дамоў, у тым ліку шляхам пашырэння асартыменту прадукцыі індустрыяльнага домабудавання для выкарыстання ў індывідуальным жыллёвым будаўніцтве. Камбінатам буйнапанэльнага домабудаўніцтва прапануецца больш актыўна ствараць сістэму паслуг па будаўніцтве індывідуальных жылых дамоў, аказанні дапамогі ў забеспячэнні будаўнічымі матэрыяламі.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Грошы

# ТАРЫФНУЮ СТАЎКУ ПАВЯЛІЧЫЛІ НА 1,2 РУБЛЯ

**З першых дзён новага года ў Беларусі была павышана тарыфная стаўка першага разраду да 31 рубля для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый.**

Аб гэтым гаворыцца ў пастанове Савета Міністраў ад 30 снежня 2016 года №1115. Згодна з гэтым дакументам, таксама з 1 студзеня ўстаноўлены штомесячныя дыферэнцыраваныя даплаты работнікам бюджэтных арганізацый, якія тарыфікуюцца 1—14 разрадамі, у памерах 8,6 — 5,7 рубля. Мінулы раз тарыфная стаўка першага разраду павышалася ў нас летась у красавіку — да 29,8 рубля.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Да ведама

# «Чаргавікам» дадуць даступныя крэдыты

**Белагапрамбанк плануе ўжо вясной пачаць выдачу так званых паўільготных крэдытаў на будаўніцтва жылля, паведаміў намеснік старшыні праўлення банка Віталь КРУК.**

Ён удакладніў, што грошы будуць выдавацца патэнцыйным жыхарам шматкватэрных дамоў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Агульны аб'ём плануемага крэдыту па гэтай лініі будзе адпавядаць памеру леташняга траншу — 10 млн рублёў. «Я думаю, што дзесьці з вясны пойдзе крэдытаванне», — растлумачыў Віталь Крук. Намеснік старшыні праўлення адзначыў, што ў мінулым годзе такія крэдыты былі запатрабаваныя ў грамадзян. «Іх разабралі літаральна за тры месяцы», — падкрэсліў ён. Стаўка па такіх крэдытах сёлета складзе 13,5% гадавых (стандартная стаўка банка мінус палова стаўкі рэфінансавання).

Нагадаю, што сёння крэдыты пад будаўніцтва жылля на агульных падставах камерцыйнымі банкамі выдаюцца людзям пад 20—25% гадавых

# У Магілёве запахла вясной

**Пачаўся продаж білетаў на міжнародны маладзёжны тэатральны форум M.art.кантакт-2017.**

А днямі ў абласным драматычным тэатры адбылася першая прэс-канферэнцыя, прысвечаная гэтай падзеі. Папулярны тэатральны форум пройдзе ў Магілёве з 21 па 27 сакавіка дванаццаты раз. У праграме тыдня — 22 спектаклі з 10 краін свету. Упершыню на гэта свята завітаюць тэатры з Аўстрыі і ЗША. Акрамя трох традыцыйных пляцовак будзе задзейнічана памяшканне этнаграфічнага музея, дзе тэатр-студыя «Невялікі драматычны тэатр» з Санкт-Пецярбурга пакажа «Братоў Карамазавых».

Наогул, гледачоў чакае шмат чаго цікавага і новага. Па словах дырэктара тэатра Андрэя Новікава, 80% удзельнікаў — новыя тэатры.

— Мы імкнёмся, каб афіша фестывалю была паранейшаму высокамастацкай і разнастайнай, каб са сцэны гучалі розныя тэатральныя мовы. Сучасная і класічная драматургія будуць прадстаўлены з разліку 50 на 50, — паведаміў Андрэй Новікаў.

Магіляўчан чакае шмат знакавых пастановак. Сярод іх фарс «Кароль памірае» і драма «За зачыненымі дзвярыма» рэжысёрскай лабараторыі «Вучні Тумінаса» пры Дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Я. Вахтангава і Тэатральным інстытуце імя Б. Шчукіна. Наогул, кожная з 22 пастановак не прайшла незаўважанай для тэатральнай грамадскасці. Амаль усе яны адзначаны прэстыжнымі ўзнагародамі. Застаецца дадаць, што кошт білетаў вар'іруе ад 7 да 35 рублёў. Але рэальная цана гэтых пастановак, папярэджваюць арганізатары, удвая вышэй.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Вакол спорту

# ГАЛАСУЙ ЗА ЛЕПШЫХ

**Стартаваў адкрыты публічны конкурс «Трыумф. Героям спорту», кожны балельшчык можа ўнесці свой уклад у вызначэнне самых дастойных спартсменаў і трэнераў двух апошніх гадоў.**

Найлепшых атлетаў і настаўнікаў жыхары краіны змогуць выбіраць да канца студзеня. Удзельнікамі сёлетняга конкурсу сталі спартсмены і спартсменкі, якія дамагліся ў 2015—2016 гадах значных вынікаў на буйных міжнародных спаборніцтвах.

З 10 па 31 студзеня сярод аматараў спорту праводзіцца папярэдняе галасаванне за прэтэндэнтаў на званне лаўрэатаў конкурсу па намінацыях: «Лепшая каманда», «Лепшы трэнер», «Лепшы спартсмен» і «Лепшая спартсменка». Галасаванне ажыццяўляецца на афіцыйнай старонцы конкурсу ў інтэрнэце — triumph.by. Ахвотныя таксама змогуць прагаласаваць пры дапамозе друкаваных бюлетэняў, якія размешчаны на сайтах арганізатараў: Белтэлерадыёкампаніі (www.tvr.by), Прэзідэнцкага спартыўнага клуба (www.sportclub.by), Міністэрства спорту і турызму (www.mst.by), Нацыянальнага алімпійскага камітэта (www.noc.by).

Журы конкурсу вызначыць лаўрэатаў яшчэ па чатырох намінацыях: «За волю да перамогі», «Прарыў года», «Вынік года» і «Самы яркі спартыўны момант».

Фінальнам конкурсу стане цырымонія ўрачыстага ўзнагароджання пераможцаў, якая будзе суправаджацца гала-канцэртам з удзелам артыстаў беларускай эстрады.

Нагадаем, «Трыумф. Героям спорту» з'яўляецца пятым падобным праектам. Раней конкурсы праводзіліся ў 2007, 2008, 2010, 2012 і 2014 гадах. У 2008 годзе арганізатары прынялі рашэнне зрабіць конкурс традыцыйным і рэалізоўваць праект раз у два гады, падводзячы вынікі алімпійскага сезона. З 2016 года сталі ўлічвацца вынікі двух апошніх гадоў. Такім чынам, ахопліваецца ўвесь перыяд выступленняў беларускіх спартсменаў і ўсе іх дасягненні.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# ЧЫРВАНАКНІЖНІЦА Ў БЯДЗЕ

**Незвычайны і трагічны адначасова выпадак нядаўна адбыўся ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці. Жыхарка вёскі Верамееўка знайшла на сваім падворку маленькую параненую і знясіленую рысь.**



Фота БЕЛТА.

Пра сваю знаходку яна паведаміла ў Гарадоцкую раённую інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Спецыялісты інспекцыі даставілі лясную кошку ў Віцебскі заапарк, дзе за яе жыццё змагаліся мясцовыя ветэрынары.

Дырэктар установы Ірына Арлова расказала журналістам, што ветурачы выявілі ў жывёлы пералом задняй лапы, іншыя пашкоджанні ўстанавіць было цяжка — настолькі яна была слабая і абязводжаная. На жаль, маладую самку рысі, якой было каля 8 месяцаў, выратаваць не атрымалася.

Як расказаў **старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі тэрыялогіі навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах Рыгор ЯНУТА**, выпадкаў, калі параненая дзікая жывёла прыходзіць да чалавека, вельмі мала.

Некаторыя жыхары лесу, часцей за ўсё капытныя ці дробныя драпежнікі сямейства куніцавых, селяцца недалёка ад людзей і ў цяжкую хвіліну выкарыстоўваюць гэта суседства, каб пракарміцца. Так, некалькі гадоў таму вучоныя сустракалі недалёка ад сельскіх населеных пунктаў «дамы» выдры і амерыканскай норкі.

— Але цяжка ўявіць, што буйны драпежнік накшталт ваўка ці рысі, без прыкмет агрэсіі і праяўлення шаленства, прыйдзе да чалавека. Яго можа прымусіць гэта зрабіць толькі моцнае знясіленне, — адзначыў Рыгор Янута.

Па словах **доктара біялагічных навук, прафесара Вадзіма СІДАРОВІЧА**, наўрад ці рысь шукала дапамогі непасрэдна ў чалавека. Паколькі гэта жывёла даволі далікатная, то нават пры невялікім раненні яна можа перастаць паляваць. А каля чалавечага жылля заўсёды можна чымсьці пажывіцца.

— Але, увогуле, гэта з'ява рэдкая. На маёй памяці ўсяго тры-чатыры такія выпадкі, і часцей за ўсё да людзей прыходзілі ваўкі-падранкі (жывёлы, раненыя падчас палявання) або хворыя драпежнікі, што шукалі ежу на сметніку ці хаваліся ад халадоў у сене пры ферме, — расказаў навуковец.

Вадзім Сідаровіч таксама адзначыў, што, паколькі знойдзенай рысі яшчэ не споўнілася год, верагодна, загінула і яе маці — звычайна дзеці рысі праводзяць гэты перыяд разам з маці. І толькі ў канцы лютага — сакавіку, калі ў дарослых жывёл пачынаюцца спарванні, лясныя кошкі пачынаюць самастойнае жыццё.

**Вераніка КОЛАСАВА** *kolasava@zviazda.by*

**Калі вы сустрэлі хворую, параненую ці траўміраваную дзікую жывёлу, неабходна паведаміць пра гэта карыстальніку паляўнічых угоддзяў ці ў аператыўна-дзяжурную службу тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў, ці ў дзяжурную службу раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях. Пасля гэтага інфармацыя аб знаходцы перадаецца ў тэрытарыяльны орган Мінпрыроды і раённую, гарадскую ветэрынарную станцыю, а прадстаўнікі дзяржорганаў выязджаюць на месца выяўлення жывёлы.**

■ Інавацыі і здароўе

# «Начны дазор» за сэрцам

**Сістэму дыстанцыйнага кардыяманіторынгу «Начны дазор», якая дазваляе кантраляваць здароўе людзей у любы час сутак, распрацавалі ў БДУ.**

Навуковая ідэя належыць кандыдату тэхнічных навук, дацэнту кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ Валянціну Ярмалінскаму. Над ёю ўвасабленнем працуюць вучоныя БДУ, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Акадэміі навук Беларусі, а таксама супрацоўнікі беларускай і расійскай прыборабудаўнічых кампаній.

Сістэма нацэлена на прафілактыку сардэчна-сасудзістых захворванняў у людзей, якія знаходзяцца ў групе рызыкі. У прыватнасці, гаворка ідзе пра забеспячэнне недарагімі прыборамі хворых, якія маюць патрэбу ў дамашнім і начным кардыяманіторынгу, людзей, якія праходзяць постынфарктную рэабілітацыю, перанеслі аортакаранарнае шунціраванне і іншых. У групу рызыкі ўваходзяць таксама і спартсмены: для іх важна кантраляваць стан сэрца ў першыя гадзіны пасля трэніровак. А падчас спаборніцтваў вельмі важны і начны кантроль за арганізмам.

Рэалізацыя праекта забяспечыць новы ўзровень аказання медыцынскай дапамогі, заснаванай на аднахасовым узаемадзеянні службаў медыцынскай дапамогі, надзвычайных сітуацый, праваахоўных органаў і іншых. Пацыенты будуць знаходзіцца пад пільным кантролем мабільных праграм, устаноўленых на смартфонах карыстальнікаў, а таксама праграм на гальным вэб-серверы. Экстранныя службы адрэагуюць адразу пасля атрымання трывожнага сігналу ад апаратара ці непасрэдна ад кардыягаджэта. Гэты апарат уяўляе сабой бесправадны кішэнны прыбор, які ажыццяўляе ЭКГ, экспрэс-дыягностыку і самакантроль узроўню псіхаэмацыянальнага і фізічнага стрэсу, выяўляе вегетатыўныя парушэнні, забяспечвае кантроль дынамікі фізічнай працаздольнасці пры постынфарктнай рэабілітацыі і фізічнай самападрыхтоўцы. Мяркуецца, што «Начны дазор» дазволіць зменшыць колькасць раптоўных смяротных выпадкаў, якія адбываюцца з-за немагчымасці хуткага аказання медыцынскай дапамогі.

У цяперашні час атрыманы першыя вынікі тэрміновага і дыстанцыйнага маніторынгу стану сэрца ў студэнцкім асяроддзі. Студэнты тэсціруюцца ў лабараторыі, на занятках фізічнай культурай і спортам, у гадзіны начнога сну, пры рабоце за камп'ютарам і ў іншых сітуацыях. База даных, што фарміруецца, дапамагае адпрацаваць алгарытм работы праграмнага забеспячэння. Серыйную вытворчасць прыбораў плануецца распачаць у бягучым годзе ў прыборабудаўнічых кампаніях Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# АНТЫПРАДУКТЫ



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

***— Акрамя цукру, сёння вытворцы самай рознай прадукцыі «перакормліваюць» нас і соллю.***

— Соль солі не роўная. Напрыклад, у марской прысутнічае 81 элемент (для параўнання ў чалавечым арганізме — 82), утрымліваюцца вельмі карысныя мінералы і мікраэлементы. Хлорыстага ж натрыю ў ёй каля 80 працэнтаў, а ў каменнай солі, якую мы часцей ужываем, — каля 99. Акрамя таго, у каменную соль дадаецца антыкамкавальны агент — ферацыянід калію, што таксама нядобра. Як бачыце, можна выбіраць розныя прадукты. Напрыклад, з алеяў вельмі каштоўным з'яўляецца рапсавы. Пра яго карысць ужо багата сказана, але людзі ўсё яшчэ рэдка яго выкарыстоўваюць...

***— Што можна аднесці да «антыпрадуктаў»?***

— Усе тэрмізаваныя ёгурты. Пад маркай нечага карыснага прадаецца незразумела што з вялікім утрыманнем цукру, эмульгатараў, загушчальнікаў, кансервантаў і араматызатараў.

Напэўна, да антыпрадуктаў можна аднесці і пакетаваныя сокі. Там утрымліваецца каласальная колькасць цукру. З поспехам пад іх выглядам прадаюцца і нейкія падробкі. Мне даводзілася каштаваць розныя канцэнтраты сокаў, некаторыя замежныя ўзоры наогул не былі падобныя на сокі.

Уся выпечка ў нас сёння напічкана гідрагенізаванымі тлушчамі. У ЗША, напрыклад, прымаецца закон аб забароне выкарыстання маргарыну ва ўсіх харчовых прадуктах, і гэта ў краіне, для якой бізнес на першым месцы.

**Гідрагенізаваныя тлушчы выкарыстоўваюцца ў ежу ўжо больш за сто гадоў. Транстлушчы, што ствараюцца пры іх вытворчасці, правакуюць сардэчна-сасудзістыя захворванні. У 2003 годзе Сусветная арганізацыя аховы здароўя прызнала шкоднасць транстлушчаў, а ў 2009-м рэкамендавала іх поўнае выключэнне з харчовых прадуктаў.**

***— На што трэба звяртаць увагу на этыкетках?***

— З асцярогай трэба ставіцца да прадуктаў, на якіх напісана «з фруктовым смакам». Часта наогул не вынесена, за кошт чаго ён ствараецца. Так, на адным з заводаў такі «смак» давала дабаўка з невялікай колькасцю соку, падсаладжвальнікамі і араматызатарамі невядомага паходжання. Вывучэнне харчовых дабавак, якія сёння прымяняюцца, ідзе ў абмежаваным аб'ёме. Утрыманне некаторых з іх не кантралюецца. Не вызначаны допушчальныя дазіроўкі, як, напрыклад, з тымі ж самымі трансізамерамі тлустых кіслот. Тое, што «панавараочваў» чалавек, каб рэалізаваць свае ідэі альбо зрабіць прадукт больш танным, можа абярнуцца праз многа гадоў вялікімі праблемамі. Магчыма, нават генетычна людзі не прыстасаваныя для ўжывання такіх «хітрых» рэчаў.

***— Дык можа з газіраванымі напоямі, рознай «салодкай атрутай» трэба ўжо змагацца, як з цыгарэтамі: забараняць продаж непаўналетнім, рабіць закрытую выкладку тавару альбо ўнесці абмежаванні на размяшчэнне асабліва небяспечных прысмакаў (каб яны не прадаваліся побач з касамі, у дзіцячых паліклініках)?***

— Праблему з ужываннем дрэнных прадуктаў трэба разглядаць з пункту гледжання эканомікі. Сёння наперад выходзяць нейкія лакальныя інтарэсы, атрыманне прыбытку. Не ўлічваецца самае галоўнае, што здароўе — таксама эканамічная каштоўнасць. Без яго не будзе нармальнай працоўнай сілы, павелічэння працягласці жыцця. І канешне, забаронай ніколі нічога не вырашаецца. Успомнім, чым у савецкі час закончылася барацьба з алкагалізмам. Наогул, лепш, каб такая прадукцыя, як цыгарэты і алкаголь, прадавалася ў асобных магазінах. Так не будзе лішняй «прапаганды», бо ў агульнай чарзе разам з тымі, хто набывае, напрыклад, гарэлку, часта стаяць дзеці.

## Харчовая адукацыя

Як аказалася, забарона продажу тых жа самых чыпсаў ці газіраваных напояў у школах таксама ні на што не паўплывала, вучні набываюць усё па-за іх межамі. І вучоныя ўпэўнены, што тут трэба ісці іншым шляхам, а найперш мяняць псіхалогію, грамадства ў цэлым. І калі ў многіх сем'ях нічога не робіцца для фарміравання здаровай культуры харчавання, неабходна ўводзіць спецыяльныя адукацыйныя праграмы ў школе. Гэта могуць быць не толькі заняткі, на якіх даюцца веды аб небяспечных і здаровых прадуктах. Дзяцей можна вучыць гатаваць, складаць меню.

У Фінляндыі вучні пры жаданні могуць працаваць у школьнай сталовай, старэйшыя школьнікі часта дапамагаюць малодшым выбіраць стравы. Справа ў тым, што ў гэтай краіне ў школах харчаванне арганізавана па прынцыпе самаабслугоўвання. Настаўнікі і персанал сталоўкі даюць рэкамендацыі дзятве і такім чынам знаёмяць з прынцыпамі здаровага харчавання...

**«Мала хто задумваецца аб тым, колькі наогул цукру мы атрымліваем з прадуктамі. Напрыклад, толькі ў адной бутэльцы з газіраваным напоем яго 5 сталовых лыжак...»**

Скажаце, пра такое ў Беларусі можна толькі марыць? Тым не менш у некаторых школах ужо праводзіліся эксперыменты, калі дзеці маглі выбіраць меню і атрымлівалі тыя стравы, якія ім падабаюцца.

Уласна, размовы пра тое, што трэба нешта рабіць з харчаваннем у дзіцячых установах, апошнім часам гучаць асабліва часта. Пэўных зрухаў пад уплывам грамадскасці ўдалося дасягнуць — так, сасіскі сталі радзей з'яўляцца ў школьных сталоўках. Але, на думку вучонага, перайсці ад дыскусій да справы можна, калі ў краіне з'явіцца Нацыянальны савет па пытаннях харчавання (як гэта прынята ў еўрапейскіх краінах), што будзе каардынаваць дзейнасць усіх устаноў і ведамстваў. Сярод яго функцый — кантроль за бяспекай прадуктаў, навуковыя даследаванні, распрацоўка рэкамендацый і навучанне здароваму харчаванню.

**Па статыстыцы ў Беларусі сярод дзяцей ва ўзросце ад 7 да 17 гадоў здаровыя не больш за 25%. Пры гэтым да 15 гадоў працэнт школьнікаў з хранічнымі захворваннямі павялічваецца ў параўнанні з дашкалятамі амаль у два разы.**

Як адзначае Валерый Вікенцьевіч, навука ідзе наперад, а рэцэптуры ў дзіцячым арганізаваным харчаванні засталіся з мінулага:

— Дырэктар санаторыя «Журавушка» паскардзілася нам, што складана змяніць меню, бо даводзіцца працаваць з рэцэптурамі, распрацаванымі яшчэ ў 80-х гадах. У іх закладзены тыя прадукты, што на той час былі ў Савецкім Саюзе. А сёння ўжо не ў дэфіцыце, напрыклад, бананы, з'явілася іншая сыравіна, беларускія вучоныя пастаянна распрацоўваюць новыя рэцэптуры. Чаму не дадаць у якасці кампанента, напрыклад, такі карысны тапінамбур, які багаты на харчовыя валокны? Што перашкаджае падаваць у школьных сталовых і буфетах «кісламалочку» з пра- і прэбіётыкамі?

Цікаўлюся ў вучонага, чаму сталі ўзнімацца пытанні аб якасці бутыляванай вады і ці можна даваць яе дзецям?

**«З алеяў вельмі каштоўным з'яўляецца рапсавы. Пра яго карысць ужо багата сказана, але людзі ўсё яшчэ рэдка яго выкарыстоўваюць...»**

— Насамрэч, у Беларусі няма дзіцячай вады. Гэта маркетынгавы ход, калі нешта падаецца пад яе выглядам. Ёсць пэўныя патрабаванні да такой прадукцыі, усё дзіцячае харчаванне па нарматыўных дакументах павінна вырабляцца на асобных лініях. Але мы плануем пачаць разліваць дзіцячую ваду ў Мар'інай Горцы. Сярод навінак, якую прапануе наш інстытут, і мінеральная вада «Mineralita», якая здабываецца са свідравіны санаторыя-прафілакторыя «Сосны». Гэта другая ў краіне лячэбная мінеральная вада. Яна адрозніваецца тым, што ўтрымлівае вялікую колькасць кальцыю, магнію, сульфатаў. Такая распрацоўка зроблена ў межах праграмы па пераадоленні наступстваў аварыі на ЧАЭС. Вада можа выкарыстоўвацца пры лячэнні дзяцей, што пражываюць на забруджаных тэрыторыях, але яна карысная для ўсіх, бо дапамагае пры многіх захворваннях.

## Лоў-фуд замест фаст-фуду

Магчыма, мы зможам вярнуцца да смачнай і карыснай ежы, калі перастанем спяшацца. У Італіі, напрыклад, больш папулярная ідэя павольнага ўжывання — лоў-фуд, дзе народ любіць праводзіць час за размовамі ў кавярнях. Не трэба забывацца, што пры прыёме ежы важныя і яе знешні выгляд, і тое, якая атмасфера навокал, і нават музыка. Хіба гамбургер у шумным мітуслівым рэстаране фаст-фуду зможа супрацьстаяць прыгожа пададзенай страве?

Тыя ж шакаладныя батончыкі, якія ў рэкламе падаюцца для перапынку — перакусу, хіба не прывучаюць нас харчавацца на хаду? Напэўна, ежа стала больш прамыслова апрацаванай менавіта таму, што людзі перасталі атрымліваць задавальненне ад яе. І, напэўна, барацьбу за здаровае харчаванне трэба пачынаць з пошуку альтэрнатыў фаст-фуду. І адной з іх можа стаць... вяртанне да нацыянальнай кухні.

— Нашы продкі пакінулі тысячы рэцэптаў, — заўважае Валерый Вікенцьевіч. — Іх трэба прасоўваць, рэкламаваць адметныя справы. Такім чынам мы зможам быць больш прываблівымі для людзей, якія прыязджаюць да нас з-за мяжы.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

■ Вяртаючыся да надрукаванага

# ЧЫЯ КАРОВА, ТАГО І КЛОПАТ ПРА ЯЕ?

## Адказ з міністэрства ўнёс мала яснасці ў гэтае пытанне

**У нумары «Звязды» ад 7 снежня мінулага года ў рубрыцы «Пытальнік» быў змешчаны матэрыял «Карова прыватная. А клопат пра яе? Ці павінен ветурач сельгаспрадпрыемства аказваць дапамогу хворай жывёле з падворка вяскоўца». Падставай для яго падрыхтоўкі стала скарга Галіны Аляксандраўны Ягоравай з вёскі Карацк Клецкага раёна. Амаль за год да ліста заяўніцы ў рэдакцыю ў яе здарылася бяда: загінула карова. Па словах жанчыны, у пэўнай ступені ў тым быў вінаваты ветурач мясцовай гаспадаркі, які быццам бы адмовіўся дапамагчы. І яго напачатку за гэта пакаралі, але потым спагнанне пракурор... адмяніў. Сам ветурач выказаў нязгоду з першапачаткова прызначаным штрафам, зазначыўшы, што ён і не павінен быў аказваць ветэрынарную дапамогу жывёле жыхарцы вёскі, «паколькі я з'яўляюся работнікам юрыдычнай асобы і за стан і лячэнне скаціны, размешчанай на прыватным падворку, я не адказваю».**

Канешне, заяўніцы варта было найперш звяртацца па дапамогу ў мясцовую раённую ветэрынарную станцыю, але, паводле яе слоў, там былі выхадны. Праўда, прадстаўнікі апошняй заявілі нам, што падчас выхадных у іх арганізавана дзяжурства. Тым не менш пытанне, вынесенае ў падзагаловак матэрыялу заставалася: ці павінен ветурач сельгаспрадпрыемства аказваць дапамогу жывёле з прыватных падворкаў насельніцтва, якое пражывае ў адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы? Пагадзіцеся, ветстанцыя ветстанцыяй, але вясковы чалавек здаўна прывык звяртацца па дапамогу да таго спецыяліста, які жыве і працуе побач. І ў гэтым кантэксце праблема выходзіла за рамкі асобна ўзятай скаргі канкрэтнай заяўніцы, бо ў такую ж сітуацыю можа трапіць любы іншы ўладальнік каровы ў любым кутку краіны. Таму рэдакцыя і паспрабавала разабрацца ў ёй.

Адразу прызнаемся, што зразумелага адказу (як і ў свой час самой заяўніцы Галіне Аляксандраўне) атрымаць не ўдалося. Выходзіла так, як тлумачылі работнікі Клецкай раённай ветэрынарнай станцыі, што гэтае пытанне павінна было быць прапісаным у калектыўным дагаворы сельгаспрадпрыемства: як, на якіх умовах трэба абслугоўваць насельніцтва. Вось, падавалася б, і рашэнне праблемы! Аднак тут жа высветлілася, што сельгаспрадпрыемствы, дзе працаваў ветурач, які быццам бы адмовіўся дапамагчы жыхарцы вёскі ў яе бядзе, — замежнае. Іншымі словамі, выходзіла, што на яго тыя запісы ў калектыўным дагаворы не распаўсюджваліся, і спецыяліст меў права адмовіць заяўніцы ў яе просьбе.

Яшчэ мы даведаліся, што з 1995 года ў краіне дзейнічаў Ветэрынарны кодэкс, у якім было прапісана, што ветурач гаспадаркі павінен аказваць дапамогу насельніцтву, якое пражывае ў адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы. Аднак у 2014 годзе яго адмянілі, а новага дагэтуль няма. Карацей, пытанні ўзнікалі, а адказаў на іх па-ранейшаму не было: цягам двух тыдняў так і не атрымалася датэлефанавацца да спецыялістаў Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, каб яны пракаментавалі сітуацыю не столькі ў кантэксце канкрэтнага здарэння з каровай жыхаркі вёскі Карацк, а ўвогуле. Марна, трубку так і не знялі. Таму рэдакцыя мусіла накіраваць надрукаваны матэрыял на рэагаванне ўжо поштай. Нарэшце мы атрымалі адказ. Прыводзім яго цалкам...

«У адпаведнасці з артыкулам 25 Закона Рэспублікі Беларусь ад 2 ліпеня 2010 года «Аб ветэрынарнай дзейнасці», ветэрынарныя паслугі аказваюцца юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія маюць спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне ветэрынарнай дзейнасці, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі, а таксама дзяржаўнай ветэрынарнай службай. Непасрэднае аказанне ветэрынарных паслуг ажыццяўляюць спецыялісты ветэрынарнай службы.

Па стане на 29.12.2016 года 65 арганізацыям прыватнай формы ўласнасці выдадзены спецыяльны дазвол (ліцэнзіі) на права ажыццяўлення ветэрынарнай дзейнасці, што ўключае работы і паслугі па дыягностыцы, прафілактыцы захворванняў і лячэнні сельскагаспадарчых жывёл, жывёльных кампаньёнаў, жывёл, якія выкарыстоўваюцца ў культурных мерапрыемствах, заапарках, цырках, звярынцах, службовых і лабараторных жывёл.

Аказанне платных ветэрынарных паслуг дзяржаўнай ветэрынарнай службай ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб парадку аказання платных ветэрынарных паслуг дзяржаўнай ветэрынарнай службай, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27.06.2012 года №594.

У выпадку захворвання свойскіх жывёл уладальнік можа звярнуцца па аказанне ветэрынарных паслуг у раённую ветэрынарную станцыю адпаведнага раёна ці яе ўчастковую ветэрынарную лячэбніцу, або ў арганізацыю прыватнай формы ўласнасці.

Дэпартаментам ветэрынарнага і харчовага нагляду Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання прапанавана камітэтам па сельскай гаспадарцы і харчаванні аблвыканкамаў перыядычна інфармаваць насельніцтва краіны праз сродкі масавай інфармацыі аб парадку зваротаў грамадзян па аказанне ветэрынарных паслуг у выпадку захворвання іх свойскіх жывёл».

Уважлівы чытач зразумеў: чаканых адказаў мы так і не атрымалі. Дадзена толькі агульная інфармацыя, а канкрэтнае пытанне — дык ці павінен ветурач сельгаспрадпрыемства аказваць дапамогу скаціне з прыватнага падворка — так і павіслі ў паветры...

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*



# ХТО ЧЫМ БАГАТЫ

«Адчуваць спачуванне — гэта мы яшчэ ўмеем, — кажа вядомы акцёр і музыкант Пётр Мамонаў. — Можам паспачуваць таму, хто бязрукі. А вось паспрабуйце парадавацца за іншых!
У мяне сусед дом пабудаваў... У нас звычайна як: ды каб у цябе ўсё абвалілася. А я радуюся. Мясцовасць папрыгажэла. І добра. Няхай. Кажу: «Герман, які ў цябе дом цудоўны!» А чалавеку ж мала чаго трэба. «Так?» — пытаецца. І плача».

Думаю, кожны, перш чым навучыцца радавацца чужому поспеху, хоць раз у жыцці адчуваў разбуральнае пачуццё зайздрасці. І я — не выключэнне...

Да 9 класа я была самай лепшай вучаніцай у базавай школе. А вось калі перайшла ў сярэднюю, у мяне з'явілася «канкурэнтка». Калі мы разам атрымлівалі «дзявятку» — я была спакойнай. Але як толькі Юлі шанцавала больш — мяне знутры пачынала грызці непрыемнае пачуццё. Гэта ўжо потым, ва ўніверсітэце, я зразумела, што чым больш у групе разумнікаў, тым лепш (ёсць на каго раўняцца, таму ты не стаіш на месцы, развіваешся). І што адзнакі — зусім не галоўнае ў жыцці...

Дзве сяброўкі — Света і Каця — вучыліся разам у 5 класе. У Светы была малодшая сястра, якая хварэла на рак. Апошняя не наведвала школу два гады, бо праходзіла лячэнне ў клініцы.
На шчасце, дзяўчынка ачуняла і кожны год праводзіла летнія канікулы за мяжой. А калі вярталася, прывозіла кучу прысмакаў, васковыя алоўкі, цацкі, моднае адзенне. Гэта былі 90-я гады, калі такога яшчэ не бачылі ў маленькіх гарадах, а тым больш у вёсках. Ды і бацькі не маглі дазволіць купляць лішняе. Дык вось Каця ўвесь час зайздросціла сяброўцы і яе сястры, што тыя бясплатна столькі ўсяго пабачылі, што модна «адзяваліся». Прайшло шмат гадоў, сяброўкі выраслі (ды і ўжо даўно не сяброўкі). Света так і засталася жыць у той вёсцы, а зайздросніца Каця працуе за мяжой і носіць замежнае адзенне. Але калі ў мамы апошняй выявілі рак, усе матэрыяльныя даброты абясцэніліся з-за страху страціць роднага чалавека. Яна ўсё аддала б, каб гэтага не было.

Я дагэтуль працягваю вучыцца радавацца чужому поспеху. Штодзень. Пры гэтым стараюся адразу ж выдзірацъ, як пустазелле, карэньчыкі, што зайздрасць пускае ў сэрцы. Пакуль яны не ператварыліся ў дрэвы, пакуль не пусцілі глыбокія карані. Таксама імкнуся прытрымлівацца парады, якую атрымала аднойчы ад мудрага чалавека: «Не прымай ніякі негатыў. Пакуль ты яго не прымеш, ён належыць таму, хто яго прынёс...»

Набыў чалавек сабе новы дом — прыгожы, з вялікім садам. А побач у старэнькім доміку жыў зайздрослівы сусед, які пастаянна спрабаваў сапсаваць яму настрой: то смецце пад плот выкіне, то курэй на агарод выпусціць...

Аднойчы прачнуўся чалавек у добрым настроі, выйшаў на ганак, а там — вядро з памыямі. Ён, не раздумваючы, выліў іх. Вядро ж вычысціў да бляску, назбіраў у яго самых вялікіх і спелых яблыкаў і пайшоў да суседа.

Той, пачуўшы грукат, зларадна падумаў: «Нарэшце я яго давёў!» Адчыняе дзверы ў надзеі на скандал... А чалавек з усмешкай працягнуў яму вядро з яблыкамі і сказаў: «Хто чым багаты, той тым і дзеліцца!»

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*


Сямейная газета

**Выпуск № 1 (68)**


■ Гэта па-нашаму!

# Зайчык на пальчык

## Навошта яго браць з сабой у дарогу маладым матулям?



Фота Надзеі БУЖАН.

Маша расказвае пра сваю першую калекцыю абрадава-абярэжных лялек, што стварыла пры дапамозе мамы.

**Са Слуцкага цэнтра традыцыйнай культуры я вярнулася не з пустымі рукамі. А з зайчыкам на пальчыку, якога навучыла мяне рабіць Таццяна ГЕРМАНОВІЧ, кіраўнік калектыву аматарскай мастацкай творчасці «Беларуская лялька».**
**У той жа вечар я даслала сваёй сястры ў Амерыку падрабязную відэаінструкцыю па вырабе гэтай абярэжнай цацкі. Праз некалькі гадзін атрымала ад яе ў адказ здымак з Мацвейкавым зайчыкам. Кажа, сын у захапленні.**

У захапленні пакідалі заняткі Таццяны Міхайлаўны і дзяўчаткі. Кожная таксама панесла дадому па зробленым уласнаручна зайчыку.

— Зараз у крамах вельмі шмат розных цацак. Большасць з іх хутка ламаецца. Бацькі, як правіла, тут жа набываюць новыя забаўкі. Не дзіўна, што дзеці іх не цэняць. А вось калі сваімі рукамі зробяць — іншая справа. Бывае, занясуць дадому ляльку, а назаўтра прыбягаюць і кажуць: «Таццяна Міхайлаўна, тут я нешта пацягнула, і нітачка развязалася, трэба наладзіць».


*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*


**Многія з тых, хто трапляе сюды на калясцы, падымаюцца на ногі, а некаторым пасля 18 гадоў нават здымаюць інваліднасць. Такі вынік, які можа здацца неверагодным тым, хто хоць штосьці чуў пра дыягназ ДЦП, з'яўляецца галоўнай мэтай спецыялістаў, якія працуюць у Рэспубліканскім цэнтры рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў.**

■ Цуд у дзеянні

# ДЗЕЦІ «ГУБЛЯЮЦЬ» ДЫЯГНАЗ

## пасля рэабілітацыі ў «горадзе рамеснікаў»



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Людміла КАНДРАШОВА ведае ўсіх сваіх дзяцей і заўзята падтрымлівае іх. Побач — 11-гадовыя прыгажуні Ліза ФІНЬКО і Ангеліна ДОРАШАВА, якія трапілі ў рэабілітацыйны цэнтр ужо пяты раз. Яны кажуць, што іх любімая працэдура — басейн.

Нядаўна калектыў рэабілітацыйнага цэнтра стаў адным з пяці лаўрэатаў прэміі Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне» за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы.

— Гэтая ўзнагарода — прызнанне на дзяржаўным узроўні сумеснай працы нашага цэнтра і ўсёй сістэмы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ў падыходзе да рэабілітацыі дзяцей. У нас сцёртыя стэрэатыпы ўспрымання дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Мы маем цудоўную базу медыцынскай рэабілітацыі, рэалізуем сучасныя падыходы да сацыялізацыі дзіцяці-інваліда, паспяхова працуюць прафарыентацыйныя метадыкі. Нашы выхаванцы займаюцца ў гуртках, ствараюць вырабы ў самых розных тэхніках. Многія пасля часта знаходзяць сваё месца ў жыцці як рамеснікі, — расказала **Людміла КАНДРАШОВА, дырэктар ДУ «Рэспубліканскі цэнтр рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў».**

Тут праводзіцца комплексная медыцынская рэабілітацыя: механатэрапія, крыятэрапія, электрастымуляцыя, масаж, трэнажоры, што дае ўражваючыя вынікі. Мы на свае вочы бачылі, як дзеці ідуць, усміхаюцца і абавязкова вітаюцца з усімі дарослымі, якіх сустракаюць у сценах цэнтра.


*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

# ДЗЕЦІ «ГУБЛЯЮЦЬ» ДЫЯГНАЗ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

А дзве маленькія прыгажуні па сакрэце паведамілі нам, што з нецярпеннем чакаюць чарговай дыскатэкі. Аднак галоўнае, як упэўнены спецыялісты, — гэта злучэнне ў адзіны комплекс трох напрамкаў рэабілітацыі: медыцынскай, сацыяльнай, а таксама псіхалагічнай і духоўнай (непадалёк знаходзіцца храм, куды водзяць выхаванцаў) дапамогі разам з прафарыентацыяй.

— Пры комплекснасці сістэмы мы распрацоўваем індывідуальны падыход да кожнага. Наша задача — вывесці дзіця-інваліда ў соцыум, — адзначыла дырэктар. — І нас падтрымліваюць у гэтым усе. Дзякуючы дзяржаве, рэабілітацыя дзяцей у цэнтры (як і пяціразовае харчаванне) бясплатная. Бізнесмены і проста нераўнадушныя людзі таксама дапамагаюць. А навукова-даследчы інстытут Узброеных сіл Беларусі, які з'яўляецца шэфам цэнтра, побач з выхаванцамі ўвесь час.

— Да дзетак прыходзяць і курсанты, і палкоўнікі. Няхай нашы малыя ніколі не пойдуць служыць, аднак яны дакладна ведаюць, што такое гонар і годнасць, уменне трымаць слова, дасягаць пастаўленай мэты. З дапамогай начальніка Генеральнага штаба Узброеных сіл Беларусі Алега Белаконева мы набылі крыяапарат. Гэта быў адказ на яго ж пытанне: «Чым можа армія дапамагчы дзецям?» — смяецца Людміла Мікалаеўна.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Заняткі маляваннем, аплікацыяй, выразаннем з паперы таксама прыносяць аздараўленчы эфект.



Шасцігадовы Дзяніс ШПАКОЎСКІ відавочна задаволены крыяапаратам: «Мне тут вельмі падабаецца. Я ўжо шосты раз прыязджаю, і трэці раз — адзін, без таты».

Карэспандэнты «Звязды» на сабе паспрабавалі ўздзеянне гэтага вельмі эфектыўнага абсталявання.

— Дзецям мы тлумачым, што дзьмём на іх халодным фенам. Тэмпература паветра, якое кропкава падаецца на скуру дзетак, — 16—17 градусаў, але праз моцны напор ствараецца адчуванне лёгкага холаду, — расказала пра працу агрэгата **Наталля ЗВЁЗДАЧКІНА, медсястра фізіятэрапеўтычнага аддзялення.** — Хвілін праз пяць пасля працэдуры дзеці адчуваюць рэзкае цяпло, бо сасуды расшыраюцца, таму што да іх прылівае кроў. Мышцы атрымліваюць дадатковае сілкаванне і становяцца мяккімі, расслабляюцца, у іх знікае напружанне. А гэта тое, што трэба нашым дзеткам.

У цэнтры акумулююць усе новыя веды, якія з'яўляюцца ў свеце і могуць дапамагчы ў рэабілітацыі маленькіх пацыентаў. Кожны педагог тут цікавы не толькі як асоба, а і як рукадзельнік — яны ўмеюць рабіць літаральна ўсё. Самі спецыялісты жартуюць, што тут у іх горад рамеснікаў. Займаюцца валеннем шэрсці, вырабамі са скуры, пяску, гліны, гіпсу, дэкупажам.

Прыязджаюць малыя сюды ў залежнасці ад паказанняў урачоў, бывае што і некалькі разоў у год. Бацькам ці апекунам, якія суправаджаюць іх, гасцініцу пры цэнтры бясплатна могуць выдзеліць толькі раз у год. Дарэчы, з імі псіхолаг таксама праводзіць асобную работу, каб дапамагчы зразумець тое, што адбываецца з дзецьмі.

Асаблівы падыход да рэабілітацыі ствараюць дзецям, якія паступілі ў навучальныя ўстановы да 18 гадоў. Зараз тут знаходзяцца, напрыклад, студэнты Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.І. Глінкі.

— Мы стараемся адсочваць дасягненні ўсіх нашых дзетак, а ў будучым хочам устанавіць новую праграму, каб на яе падставе даваць малым рэкамендацыі па навучальных установах, працаўладкаванні і месцы жыхарства. Каб не толькі прывіць ім навыкі прафесіі, але і ўдзельнічаць у іх далейшым жыцці.

**Ірына СІДАРОК.**

*sidarok@zviazda.by*

■ Балючая тэма

# «ХТО ТАМ НЕ БЫЎ, ТОЙ НЕ ЎЯЎЛЯЕ...»



## Акушэр-гінеколаг — пра тое, чаму яна адмовілася рабіць аборты

**Нараджэнне дзіцяці спакон вякоў асацыявалася з пачаткам новага жыцця, са святлом і чысцінёю. Сёння ж зусім не дзіва, калі цяжарнасць успрымаецца як непажаданы выпадак і разглядаюцца варыянты прадухілення «нечаканасці». Што дае штуршок жанчыне, каб пайсці на аборт? Якая роля ў такой сітуацыі належыць доктару: выканаўцы ці кансультанта? Што ставіць у прыярытэт — палітыку дзяржавы ў галіне нараджальнасці ці асабістае права выбару жанчыны?**

### На скрыжаванні маралі і закону

Сёння абсалютная забарона на аборты ўведзена ў больш чым ста дзяржавах. Сярод іх — Чылі, Нікарагуа, Ватыкан, Сальвадор, Мальта, Філіпіны і інш. У трэцяй часткі краін перарыванні цяжарнасці праводзяцца толькі па сацыяльных і медыцынскіх паказаннях.

**«Я адказала: грашу, але вы ўсе саўдзельнікі. Тады кожны задумаўся над тым, што мы робім».**

Масавыя акцыі ў Польшчы, якія атрымалі назву «Чорны пратэст», разгарнуліся ў канцы верасня мінулага года. Тады жыхары праз мітынгі і забастоўкі выказалі абурэнне, выкліканае намерам улад увесці забарону на аборты. У выніку законапраект большасцю галасоў быў адхілены.

Закон Рэспублікі Беларусь аб «Ахове здароўя» (ад 18.06.1993) дае жанчыне права «самой вырашаць пытанне пра мацярынства». Аборт дазваляецца пры тэрміне не больш за 12 тыдняў. Калі ёсць сацыяльныя паказанні, гэты тэрмін можна працягнуць да 22 тыдняў. А вось пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў перапыненне цяжарнасці дазваляецца ва ўстановах аховы здароўя на любым тэрміне.

Сёння заканадаўства прадугледжвае толькі два сацыяльныя паказанні для абортаў. Гэта цяжарнасць у выніку згвалтавання і пазбаўленне судом бацькоўскіх правоў. Дарэчы, яшчэ два гады таму пазбавіцца ад дзіцяці можна было ў 10 выпадках.

### «Ён зараджае мяне дзіцячай непасрэднасцю...»

Алена даведалася пра цяжарнасць, калі ёй было 17 гадоў. Дзяўчына толькі скончыла школу, паступіла на прэстыжную спецыяльнасць у сталічны ўніверсітэт. Жыццё маладзіцы кіпела, пакуль не прыйшла нечаканая навіна — «я буду маці».

— Мяне агарнула пачуццё, быццам свет бурыцца на кавалкі. Першае, што я зрабіла, — патэлефанавала маці. Яна прыехала ў Мінск, разам схадзілі на УГД. Паказала пяць тыдняў. Тады я была вельмі разгубленая. Не даваў спакою юнацкі максімалізм. Я лічыла, што ўсё павінна ісці сваім чынам, што нельга нараджаць без мужа, што трэба атрымаць адукацыю. Маці тады сказала правільную рэч: «Я нічога не магу табе параіць, гэта павінна быць толькі тваё рашэнне. Так, цяжкае, але тваё». І я вырашыла пайсці на аборт.

З бацькам свайго дзіцяці Алена сустракалася з 10 класа. Спачатку ўсё было добра — кветкі, каханне і бесклапотнасць. Потым яна зразумела, што выбрала не надта годную кандыдатуру. Хлопец пачаў раўнаваць дзяўчыну да сяброў, выказваць незадаволенасць яе захапленнямі. Калі малады чалавек даведаўся пра цяжарнасць, у яго не было слоў (ды і што скажаш у 17 гадоў). Гаварылі за яго, у асноўным, бацькі. Аднак Алене патрэбна была падтрымка бацькі дзіцяці, і яна яе атрымала: у ноч перад абортам хлопец адправіў паведамленне са словамі «я кахаю цябе і буду любіць наша дзіця».

— Канешне, на той момант гэтыя словы адыгралі выключную ролю. Памятаю, як зранку ў пакой уварвалася маці, бо трэба было ўжо збірацца ў цэнтр. А я кажу: аборту не будзе.

Але пасля гэтага ўсё змянілася. Бацькі хлопца пры кожнай сустрэчы акуратна заклікалі дзяўчыну ўсё яшчэ раз абдумаць, гаварылі, што ў іх ёсць знаёмыя ўрачы. У хлопцы Алена цалкам расчаравалася. Маладыя людзі не мелі зносін аж да нараджэння дзіцяці. Потым зноў наладзілі кантакт, нават жылі разам некаторы час. Гэта не прывяло да моцнага сямейнага саюзу. Сёння бацька наведвае малога два разы на год — у дзень нараджэння і на Новы год.

— Тады мне вельмі дапамаглі ўрачы, — працягвае Алена. — Яны моцна паўплывалі на канчатковае рашэнне. Адна мне сказала, што маладыя дзяўчаты прыходзяць і не могуць мець дзяцей, таму я павінна радавацца. Другая падзялілася: «У мяне таксама няма мужа, але гэта не прычына пазбаўляцца ад дзіцяці».

Алена адмоўна ставіцца да забароны абортаў на заканадаўчым узроўні. Яна лічыць, што дзяржава не можа вырашаць за жанчыну. Тым больш, кожная забарона правакуе на тое, каб яе парушаць.

Сёння сыночку дзяўчыны ўжо тры з паловай гады. Алена шчаслівая, што не зрабіла глупства і дала жыццё роднаму чалавечку.

— Я разумею, што не магу жыць без яго, — тлумачыць дзяўчына. — Заўсёды шукаю магчымасць з ім убачыцца. Пакуль выхаваннем займаецца мой бацька. Я працягваю вучыцца на дзённым аддзяленні. Сын зараджае мяне дзіцячай непасрэднасцю, і разам з ім я адчуваю сябе сапраўды шчаслівай.

### «Да апошняга размаўляю з кожнай жанчынай»

Марыя Астаф'ева ўсё жыццё працуе акушэрам-гінеколагам. Сёння яе стаж дасягнуў 36 гадоў. «Канешне, за сваё жыццё я шмат чаго зрабіла: і роды прымала, і аборты даводзілася рабіць, — прызнаецца Марыя Віталеўна. — Ад абортаў я адмовілася гадоў дзесяць таму. Мы пакрысе ад гэтага адыходзілі. У савецкія часы ад абортаў адмовіцца было нельга. Раней па 15—20 на дзень рабілі. Паменшылася колькасць, калі гэта стала платнай паслугай».

У паліклініцы, дзе працуе Марыя, амаль усе ўрачы адмовіліся ад абортаў пасля папраўак 2014 года ў Законе «Аб ахове здароўя». Згодна са зменамі, спецыяліст мае права адмовіцца ад правядзення перарывання цяжарнасці па рэлігійных і маральна-этычных перакананнях.

— Добра памятаю выпадак з практыкі: я сяджу, санітарка трымае люстэрка, медсястра падае інструменты, збоку стаіць анестэзіёлаг. А ў той дзень было нейкае рэлігійнае свята. Хтосьці ляпнуў «грашыць сёння нельга» з намёкам на мяне. Я адказала: грашу, але вы ўсе саўдзельнікі. Тады кожны задумаўся над тым, што мы робім.

Першы аборт Марыя памятае выразна: «Было невыноснае пачуццё страху. Тады я была яшчэ зусім «зялёная». Хто там не быў, той не ўяўляе, што гэта такое. Заўсёды перажываеш, заўсёды рызыкуеш».

— Я праціўнік абортаў. Да апошняга размаўляю з жанчынай. Да кожнай трэба знайсці свой падыход. Аднойчы на прыём прыйшла 40-гадовая жанчына з мужам. Ён не хацеў дзіцяці. Я павяла на УГД, паказала ручкі, ножкі. Гэта часта ўздзейнічае на будучых бацькоў. Пасля мужчына змяніў сваё меркаванне. Апошні выпадак быў зусім абсурдны. Як я ні даводзіла жанчыне, што аборт — не лепшае выйсце, яна стаяла на сваім. Ноччу патэлефанаваў яе муж з пытаннем «Ці можна як-небудзь прамыць страўнік?» Яна выпіла таблетку, а потым перадумала. Уявіце абсурдныя сітуацыі!

Страшна, калі дзяўчыне нельга нараджаць па медыцынскіх паказаннях. Такіх выпадкаў — процэнты. Гэтыя жанчыны, як правіла, вельмі хочуць дзіця. Памятаю, калі была ў нас даволі маладая жанчына, інфікаваная ВІЧ. Дома яе чакала дзіця. Куды ёй нараджаць? Ёсць шмат медыцынскіх паказанняў — цяжкія захворванні сэрца, нырак і інш. На практыцы сутыкалася з невыноснымі таксікозамі. Таксама прыходзілася перапыняць цяжарнасць.

У асноўным жа жанчына ідзе на аборт асэнсавана, калі яе дома ніхто не падтрымаў. «Была ў мяне дзяўчына, якая сустракалася з хлопцам, потым даведалася пра цяжарнасць, — успамінае Марыя. — Бацька дзяўчыны быў настроены катэгарычна. Аднак яна пакінула дзіця. Усе 9 месяцаў ён не размаўляў з дачкой. Праз некаторы час я ўбачыла, як гэты дзядуля гуляе з унучкай і гучна смяецца. Канешне, неабходна, у першую чаргу, падтрымка мужа. Калі чалавек кахае — ён ніколі не зробіць кепска сваёй жанчыне».

**Вераніка УЛАСЕВІЧ.**

*veronika.ulasevich@mail.ru*

■

#### Даведка «Звязды»

Штогод у свеце ідуць на аборт каля 55 мільёнаў жанчын. Гэта пятая частка ад усіх выпадкаў цяжарнасці. Каля 70 тысяч жанчын штогод паміраюць ад пасляабортных ускладненняў. Пасля першага перарывання цяжарнасці кожная пятая жанчына робіцца бясплоднай. У Беларусі рэгіструюць каля 2 тысяч абортаў штомесяц. Сярод прычын, з-за якіх жанчыны адважваюцца на аборт, вылучаюцца непасрэднае рашэнне самой жанчыны (40%), пагроза яе здароўю (25%), сацыяльныя праблемы (23%) і анамаліі развіцця плода (12%).

■ Выпрабавана на сабе

# Колькі каштуе спа-працэдура?

## Хочаце бясплатна? Рыхтуйце грошы!



***— Салон «Д...» запрашае вас на бясплатную спа-працэдуру па доглядзе за тварам, — пачула я прыемны голас раніцай у панядзелак.***

***— З чаго такі раскошны падарунак? — скептычна спытала я, бо ўвогуле не веру ў «бясплатны сыр».***

***— Ваш нумар пакінуў нехта са знаёмых.***

***(Дарэчы, на хатні тэлефон мне ўжо каторы раз званяць і прапануюць то бясплатна адрэгуляваць вокны, то прадыягнаставаць камп'ютар. Як правіла, за гэтым «хаваецца» звычайная рэклама і навязванне нечага набыць).***

***Інтуіцыя «падказала», што можна натрапіць на цікавую інфармацыю для будучага матэрыялу, і я згадзілася.***

### ДЗЕЯННЕ ПЕРШАЕ: ДРАМА

Бізнес-цэнтр. Спа-салон на 10-м паверсе. Мяне сустрэлі шыкоўная абстаноўка з белымі скуранымі канапамі, вялікі тэлевізар на сцяне, гучная музыка. Ветлівая дзяўчына на рэсэпшэне папрасіла пачакаць. Дарэчы, чакаць давялося паўгадзіны. За гэты час прыйшло яшчэ 6 жанчын на адпаведную бясплатную працэдуру. Шчыра кажучы, усе яны былі мала падобныя на тых, каму такія працэдуры па кішэні. Завітала і пастаянная кліентка, вакол якой замітусілася касметолаг, — пабегла рабіць каву.

Нарэшце і за мной прыйшла маладая дзяўчына ва ўніформе, як у медыка. На бэйджы напісана «Елізавета», ніякай спецыялізацыі не значылася. Яна правяла мяне ў адзін са шматлікіх кабінетаў. Усяго іх было, здаецца, штук трыццаць, не менш.

Спачатку гаварылі пра тыя праблемы са скурай, якія хвалююць мяне. Потым разглядалі мой твар у вялікім люстэрку. Аказваецца, што, акрамя, як мне падалося, маленькіх недахопаў, у мяне, насамрэч, расшыраныя поры, высыпанне, нераўнамерны колер скуры, ужо пасяліліся «гусіныя лапкі» вакол вачэй, і ў 29(!) гадоў звісае скура на ніжняй зоне.

Дарэчы, я кожны дзень гляджуся ў люстэрка і нічога адпаведнага не прыкмячала. Да таго ж я разумела, куды іду, і была псіхалагічна падрыхтаваная, таму крытычныя заўвагі мяне не кранулі. Але я ўпэўнена, што любая іншая жанчына на маім месцы засмуцілася б і пачала мітусіцца.

Яшчэ мая кансультант вельмі красамоўна паведаміла, якія далейшыя ўзроставыя «перспектывы» мяне чакаюць, калі не пачынаць догляд ужо зараз. Карацей, хібаў шмат, а таму мне абавязкова патрэбна дапамога іх салона, дзе выкарыстоўваюць цудадзейную касметыку ізраільскага паходжання.

Коратка, хвілінак 15, мне падрабязна расказвалі пра тую самую касметыку. Дакладней, Лізавета называла яе «касмецэўтыкай», бо яна працуе на дэрмальным узроўні, гэта значыць, на самых глыбінных слаях скуры. Галоўнае адрозненне ад іншых крэмаў і масак — 97 працэнтаў натуральных кампанентаў — адсюль і цудадзейнасць: і маршчынкі разгладзіць, і вільготнасць скуры павысіць, і правільна сальныя залозы «працаваць» навучыць.

Каб упэўніцца ў асаблівых уласцівасцях іншаземных сродкаў, мы перайшлі да практыкі. Ачысцілі скуру ад змярцвелых клетак, нанеслі маску, потым крэм з залатымі часцінкамі і ўрэшце апрацавалі ўльтрафіялетам. Між іншым, Лізавета спытала, ці ведаю я, колькі каштуе адпаведная працэдура ў іх салоне. Назвала суму ў 200 рублёў новымі грашыма. І адразу паказала прайс — прапанавала купіць набор касметыкі за 2290 рублёў, а таксама апарат за 210 рублёў і гадавы курс абслугоўвання за 180 рублёў у месяц. Дарэчы, касметыкі хопіць на год, а то і паўтара. Якім чынам такі доўгі тэрмін будзе захоўвацца касметыка амаль з поўнасцю натуральных кампанентаў, засталося патаемным. Прадугледжвалася і растэрміноўка на 3 і 6 месяцаў.

### ДЗЕЯННЕ ДРУГОЕ: ЦУД АДБЫЎСЯ!

— А вы карыстаецеся такой касметыкай? — запытала я Лізавету. — Яна адказала, што так. — Вашай зарплаты хапае на гэта? — Не, але я назбірала грошай, — быў адказ.

Скончылі.

— Хуценька пабеглі глядзець у люстэрка, — падганяла Лізавета. Па яе словах, эфект — неверагодны, ужо прыкметны. Шчыра кажучы, твар выглядаў пасвятлеўшым, свежым. Раптам выявілася, што якраз сёння мяне чакае шмат скідак і бонусаў.

— Вам што-небудзь падыходзіць? — запытала Лізавета, зноў палажыўшы перада мной прайс.

— Мне цана не падыходзіць, — адрэзала я.

— Вельмі шкада, што губляеце такія выгадныя ўмовы, — нібы здаўся мой кансультант.

Якраз вызваліўся кабінет камп'ютарнай дыягностыкі, і мяне павялі на тэсціраванне. Пачалі параўноўваць апрацаваную і неапрацаваную часткі твару.

— Так, бачу, вы рабілі чысткі, — задуменна вымавіла дыягност, нібы варажбітка. (Дарэчы, пра чысткі я сама сказала, калі мне тэлефанавалі.) Рубцы... усё праявіцца на твары... гармон... перабудова арганізма... шмат меланіну... мала вільгаці... незваротны працэс, — без перапынку сыпала гучнымі словамі маладая дзяўчына з наяўнымі скурнымі праблемамі на твары.

Цікава, чаму яна сама не карыстаецца гэтымі сродкамі і не робіць працэдуры, калі так добра ўпэўнівае ў іх лячэбным эфекце? На гэтае пытанне Лізавета таксама не дала мне выразнага адказу.

### ДЗЕЯННЕ ТРЭЦЯЕ: ЗНОЎ ДРАМА

Калі вярнуліся ў кабінет — зноў удача! Мне прапанавалі комплекс па доглядзе за скурай, які каштуе ўдвая танней, накіраваны больш на ачышчэнне і падцяжку менавіта мне.

Пакуль апрацоўвалі другую палову твару, я пачула жахлівую гісторыю пра пацыентку, якая не згадзілася на паслугі салона, і ў яе палопаліся сасуды на твары, у выніку чаго той стаў сінім, як у п'яніцы, і жанчыну звольнілі з працы. Ну, нейкі зусім адчайны ход.

Калі і пасля гэтага «арэшак не раскалоўся», наведалася «цяжкая артылерыя» — прыйшоў дырэктар з папрокам: «Як гэта вы не хочаце дапамагчы самой сабе? Гэта ж глупства!» Усе мае тлумачэнні, што ў мяне проста няма такіх грошай, ён не разумеў і працягваў наводзіць жах.

— Калі няма грошай, каб выправіць праблемы са скурай, — гэта яшчэ не канец свету. Што рабіць, калі ў маці смяротна хварэе дзіця?.. — былі яго апошнія словы.

Я хутка развіталася і бягом адтуль, правёўшы ў салоне дзве з палавой гадзіны.

### ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

У ліфт зайшла разам з немаладой жанчынай.

— Вы пастаянны кліент? — спытала яна мяне.

— Не, прыходзіла на бясплатную працэдуру, — усміхнуўшыся, адказала я.

— Я некалі таксама вось так прыйшла... — сумна пачала мая субяседніца і расказала, як некалькі месяцаў таму спакусілася на «выгадныя» ўмовы і набыла чамаданчык з «чароўнымі» сродкамі. Але дома дзеці «адкрылі вочы», і пасля доўгіх напружаных перамоў салон усё ж такі згадзіўся забраць касметыку назад.

На самай справе такіх «ахвяр» вельмі шмат, аб чым красамоўна кажуць сацыяльныя сеткі, ужо нават створаны групы «пацярпелых» ад бясплатных працэдур. Адны лічаць гэта махлярствам, іншыя сцвярджаюць, што кансультанты салонаў карыстаюцца гіпнозам. А гэта ўсяго толькі тонкі псіхалагічны ціск, але вельмі жорсткі, трэба сказаць. Дарэчы, такіх спа-салонаў у Мінску ўжо некалькі, аператары тэлефануюць з розных нумароў, назвы салонаў і касметычных сродкаў таксама часта мяняюцца.

Будзьце пільныя, і хопіць спадзявацца на «бясплатны сыр»!

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.**

■ Бабуля, пачытай!

## ДОБРЫ ЗАЙЦОЎ ЗВЫЧАЙ

Вясной у зайчыхі выveліся першыя зайчаняты. Вунь белыя клубочкі сядзяць пад кустом. Здалёку — нібы гурбачкі снегу. Затаіліся зайчанятки. І дрыжаць — ад холаду і голаду. Хіба мала ворагаў у зайцоў? Дзе цяпер іх мама?

Адзін паратунак для малых — добры зайцоў звычай. Якая б зайчыха ні бегла тут, спыніцца. І напоіць іх цёплым тлустым малаком.

Бо, можа, і яе дзетак цяпер корміць іншая зайчыха-маці.

## ЧАМУ МЕСЯЦ БЕЗ ВОПРАТКІ ХОДЗІЦЬ?

Захацеў неяк Месяц пашыць сабе ўбранне. Пайшоў да краўца. Зняў кравец з яго меркі.

— Прыходзь, — кажа, — праз тыдзень.

Мінуў тыдзень. Прымярае Месяц адзенне. Ды дзе там! Вузкае, цеснае. «Відаць, памыліўся», — падумаў кравец. І зноў кажа Месяцу:

— Прыходзь праз тыдзень.

Пашыў кравец. Сядзіць, чакае. Аж тут коціцца па небе Месяц. Круглы, вялікі. Тут і без прымеркі відаць: вопратка будзе малая.

Разгубіўся кравец і кажа:

— Не магу табе, Месяц, убранне пашыць. То ты як сярпок. То ў палавіне. А цяпер — у поўні. Ніколі не будзе табе ўбранне якраз.

Так і застаўся Месяц без вопраткі.

**Анатоль КЛЫШКА.**

■ Маміны дзённікі

## «АФІЦЫЯНТ, ВАДЫ!»

Сын еў суп з мясам і знайшоў костачку.

— О, я яе памыю і пакажу свайму сябру ў садзіку. Скажу, што гэта костка дыназаўра, — «загарэліся» вочы ў выдумшчыка.

☺☺☺

**Мы з Данем доўга займаліся кожны сваёй справай. Сын, напэўна, стаміўся і кажа:**

**— Можа, зробім перадых?**

☺☺☺

Даня распавядае:

— Дзеці ў садзіку кідаліся снежкамі. А я пачаў ім свістаць у свісток.

— А выхавальніца што рабіла?

— Яна па тэлефоне размаўляла. Вось я і вырашыў, пакуль яна занятая, усіх выхаваць.

☺☺☺

**— Заўтра ўвечары бацькоўскі сход, — кажу я Даню. — Будуць расказваць, як ты сябе паводзіш. Ты ж слухаешся выхавальніц?**

**— Так, — кажа Даня. — Толькі давайце не пойдзем на гэты сход.**

☺☺☺

Да нас прыехаў дзядуля ў госці.

— Хадзем пакажу табе сюрпрыз, — павёў Даня дзядулю ў свой пакой.

— І дзе сюрпрыз? — азіраецца той па баках.

— Вось! Тысячы!

☺☺☺

**Трохі пазней.**

**— Давай будзем заўсёды ў зале гуляць, — прапануе сын дзядулю.**

**— А чаму не ў тваім пакоі?**

**— Каб у мяне заўсёды тысяча была.**

☺☺☺

Даня з дзядулем гуляюць у «ядомае-неядомае». Унук загадвае:

— Яблык і дзве цагліны!

☺☺☺

**Муж захварэў. Кажа:**

**— Я сабе асобны посуд пастаўлю, і дай мне ручнік для твару асобны.**

**— Мама, давай яго пену для галення таксама асобна паставім, — прапанаваў сын.**

☺☺☺

— Мама, калі нараджаецца малы, ён пачынае ўсё грызці, — раптам кажа Даня.

— Нічога страшнага, у яго рэжуцца зубкі. Ты таксама ўсё грыз.

Даню, здаецца, не задаволіў такі адказ, бо ён раз'юшана запытаў:

— Ты што, хочаш пагрызенымі патэльнямі карыстацца?

☺☺☺

**Даня вярнуўся пасля заняткаў гімнастыкай.**

**— Ну што, будзем вячэраць?**

**— Не, я не галодны, я ў садзіку еў «бабку».**

**— Яна падчас трэніроўкі не «выйшла»? — пытаюся, маючы на ўвазе, што шмат энергіі затраціў.**

**— Не, я не хадзіў у прыбіральню.**

☺☺☺

Даню пасадзілі за святочны стол, павязалі сурвэтку вакол шыі.

— Як у рэстаране! — каменціруе бабуля.

— Афіцыянт, вады! — тут жа адрэагаваў малы.



**Запісала Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.**

# ЗАЙЧЫК НА ПАЛЬЧЫК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Кабінет, дзе звычайна праводзіць заняткі Таццяна Германовіч, нагадвае сапраўдны музей. Якіх лялек там толькі няма! І батлеечныя, і пальчатковыя, і, асабліва любімыя дзеткамі, абрадава-абярэжныя. У адных тварыкі тэкстыльныя, у іншых — выразаныя з дрэва ці адлітыя з пластыку... Але, што прыемна, большасць з іх маюць адзенне з беларускім каларытам.

— Мы з дзеткамі пастаянна эксперыментуем. Вось нядаўна апусцалі ў ёмістасць з заваранай кавай тканіну, з якой потым шылі лялек. У выніку кожная мела свой непаўторны ўзор. Робім і папулярныя апошнім часам замежныя «тыльды», але выглядаюць яны ў нас, як сапраўдныя беларусікі *(усміхаецца).*

**«Раю матулям, выпраўляючыся ў дарогу з малечай, класці зайчыка з сабой у кішэню. Як толькі дзіця пачне капрызіць — можна дастаць і пагуляць з ім».**

...Увесь той час, што мы разглядалі лялек, за сталом ціха сядзела дзяўчынка і дарабляла зайчыка (як высветлілася, гэта трэцякласніца Маша — дачушка Таццяны Міхайлаўны). Я ахвотна прыняла прапанову далучыцца да яе і атрымала невялічкі кавалачак тканіны.

— Акрамя тканіны, нам яшчэ спатрэбяцца ніткі, сінтэпон і маленькі бубенчык, — кажа Таццяна. — Зайчык на пальчык робіцца досыць лёгка. Як, прынамсі, і большасць абярэжных лялек. Тым не менш, кожная з іх мае глыбокае сімвалічнае значэнне. Праўда, Машуля? Раскажаш дзяўчатам пра лялькі, якія мы з табой рабілі на конкурс «Калыска талентаў»?

Маша ахвотна дастае з паліцы льняную падстаўку, на якой пяць прыгожых лялек у льняных строях з вышыўкай. І пачынае расказваць пра кожную *(што парадавала)* пабеларуску.

— Гэта Трохкольца. У яе *(прапаноўвае памацаць)* галава зроблена з пустога грэцкага арэха. Унутр яго я паклала 7 зярнятак грэчкі. Чуеце *(трасе лялькy)* ціхі і прыемны глухі гук? Ён супакойвае хворага чалавека. Часам гэтую ляльку давалі ў ручкі маленькім дзеткам, каб яны хутчэй засыналі.

— Трохкольцу таксама можна даваць дзеткам, у якіх рэжуцца зубкі, — дадае Таццяна. — Але больш за ўсё мае дзяўчаткі любяць рабіць ляльку на шчасце.

— Шчаслівіца, хоць сама і маленькая, але мае вельмі доўгую касу, — працягвае Маша. — Апошняя сімвалізуе шчасце, таму чым яна даўжэйшая і таўсцейшая — тым лепш.

— Нашы продкі косы звычайна рабілі з ільняной кудзелі, а лён, як вы ведаеце, мае вызначаную даўжыню, — кажа Таццяна. — Мы ж з дзеткамі бяром вязальныя ніткі. Дык дзяўчаты гатовыя гэтыя косы зрабіць на ўсю даўжыню кабінета.

— Касу абкручвалі вакол тулава Шчаслівіцы *(паказвае)* і насілі ляльку з сабой у кішэні, асабліва калі адпраўляліся ў падарожжа.

***— Маша, а якая твая сама любімая лялька?*** — цікаўлюся.



**Вось такога зайчыка на пальчык зрабіла мая сястра для свайго маленькага сына.**



Фота Надзеі БУЖАН.

**На сваіх занятках Таццяна ГЕРМАНОВІЧ знаёміць дзетак і з традыцыямі продкаў. Вось гэта, напрыклад, калядоўшчыкі.**

— Пажадальніца. Бо ў яе шмат прыгожванняў...

— Як і ўсім дзеткам, Машы падабаецца тое, што бліскучае, — усміхаецца Таццяна.

— Гэтую ляльку трэба ўпрыгожваць гузікамі, стужачкамі, пацеркамі і пры гэтым загадваць жаданне. Каб яно споўнілася, лепш схаваць Пажадальніцу ў шафу ці куфар, падалей ад чужых вачэй.

Паказала нам Маша і анёла з крыльцамі. Ён таксама, як і зайчык, надзяваецца на пальчык. Праўда, анёлак атрымліваецца крыху цяжэйшым, таму яго звычайна рабілі для старэйшых дзетак.

— Самае складанае ў зайчыку — гэта правільна замацаваць ніткай вушкі, — расказвае і паказвае Таццяна. — Дарэчы, пры вырабе абярэжных лялек ёсць правіла: вузлоў павінна быць тры. Гэта сакральная лічба, лічылася, што яна таксама здольная абараніць. А цяпер вазьміце кавалачак сінтэпону і сфармуйце галаву свайму зайчыку. Можна, як рабілі гэта нашы продкі, набіць яе абрэзкамі тканіны ці кавалачкам ільняной кудзелі. Але вату выкарыстоўваць не раю, бо цацка тады атрымаецца занадта цяжкай для маленькага дзіцяці.

Упершыню Таццяна даведалася пра зайчыка на пальчык ад сваёй прабабулі. У вёсцы Семежава, адкуль яна родам, усе рабілі такія лялькі.

— Памятаю, прабабуля падштурхоўвала зайчыка рукой. І мне здавалася, што ён жывы. Бывала, яна якую-небудзь казку складзе на хаду пра зайчыка. Раю матулям, выпраўляючыся ў дарогу з малечай класці зайчыка з сабой у кішэню. Як толькі дзіця пачне капрызіць — можна дастаць і пагуляць з ім.

Першую ж сваю ляльку Таццяна пашыла, калі яшчэ вучылася ў першым класе. Потым бабуля, майстрыха на ўсе рукі, навучыла яе вышываць.

— Калі вырасла, я таксама вучыла тут, у слуцкім цэнтры традыцыйнай культуры, дзяўчынак вышываць крыжыкам. У вольны ж час рабіла адзенне для пальчаткавых лялек, якія ўдзельнічалі ў пастаноўках нашага тэатра «Пралеска». Калі дырэктар даведалася, што ў Слуцку будзе праводзіцца першы абласны конкурс «Беларуская лялька», прапанавала паспрабаваць свае сілы. Тады я зрабіла па старадаўняй тэхналогіі вось гэтых батлеечных лялек па матывах народнай казкі «Дзед і жораў». І атрымала за іх Гран-пры. Пасля гэтага мне прапанавалі весці гурток па вырабе беларускай лялькі.

***— Чаму вы параіце бацькам запісваць сваіх дзетак у падобны гурток?*** — цікаўлюся ў Таццяны Міхайлаўны.

— У першую чаргу, тут развіваецца дробная маторыка. Мая дачка змалку шмат часу бавіць у цэнтры традыцыйнай культуры. Займаецца не толькі лялькамі, але і саломкай. І я бачу, што гэта добра адбіваецца на яе поспехах у школе. Акрамя таго, эстэтычны густ развіваецца. Спачатку ў дзяўчатак, калі яны бачаць шмат яркіх кавалачкаў тканіны — вочы разбягаюцца. Першыя лялькі ў іх атрымліваюцца, як правіла, занадта стракатыя. З цягам часу пачынаюць прыглядацца: а можа, тут гэтыя бліскучыя будуць лішнімі? Акрамя таго, выраб лялек — выдатная магчымасць далучыць дзетак да нашай спадчыны.

**«Пры вырабе абярэжных лялек ёсць правіла: вузлоў павінна быць тры. Гэта сакральная лічба, лічылася, што яна таксама здольная абараніць».**

Беларускія лялькі ў свой час былі незаслужана забытыя. Зараз цікавасць да іх вяртаецца. Прычым не толькі ў дзетак. Лізу да мяне ў гуртож прыводзіць бабуля. Пакуль я займаюся з дзяўчынкамі, Ніна Іванаўна, як правіла, сядзіць і вяжа. Дык вось нядаўна яна мяне прыемна здзівіла. Натхнілася нашымі заняткамі і зрабіла ўласнаручна дома вось гэтую скарбонку-траўніцу (яна напаўняецца духмянымі зёлкамі і кладзецца побач з ложкам, каб чалавеку сніліся добрыя сны), якую падарыла цэнтру.

На развітанне Таццяна з Машай падарылі нам з фатографам па Божаму воку. Гэта традыцыйная абярэжная беларуская лялька, падобная да ўсходняй мандалы. Вешалася яна ў прыхожай, якраз насупраць уваходных дзвярэй. Так, каб калі нейкі чалавек заходзіў, то яго погляд спачатку падаў на Божае вока. Лічылася, што яно забірае негатыўную энергетыку і засцерагае ад суроку.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*
*Мінск—Слуцк.*

■ Фантазія без межаў

# Шчаўкунок... на ёлцы

**А таксама Каламбіна, П'еро, Сіньёр Памідор, карэта для Папялушкі, Планета Маленькага прынца... Больш за 90 крэатыўных цацак упрыгожылі ёлку ў фае Вялікага тэатра оперы і балета.**

Самай маленькай удзельніцы конкурсу «Навагодняя тэатральная лялька» — усяго чатыры гадзікі: Сафійка Цвірко пры дапамозе мамы зрабіла балерыну-анёла. Самага ж вялікага тэатральнага героя давялося размясціць побач з ёлкай: і не дзіўна, бо памерам Шчаўкунок, якога пашыў Саша Пастушкоў, — у палову дарослага чалавека. Цацкі зроблены з самых розных матэрыялаў: паперы, пап'е-машэ, гліны, тканіны, ваты...

— А вось, паглядзіце, якая арыгінальная ёлка... з макаронаў, — усміхаецца **намеснік генеральнага дырэктара Вялікага тэатра оперы і балета Святлана КАЗЮЛІНА.** — Першае месца заняла вось гэтая тэмпераментная Кармэн сям'і Сінкэ, другое — карэта для Папялушкі Кацярыны Шафранскай, трэцяе — Шчаўкунок Міхаіла Клімава. Гран-пры журы прысудзіла Анастасіі Тузік за ляльку «Каралева». Асабіста ж мяне ўразіла філігранная работа пад назвай «Ноч перад Раством»: унутры шклянога шарыка з пластыліну дзесяцігадовая дзяўчынка разам з бацькамі вылепіла казачны дамок і ялінку. Як бачыце, дзіцячая фантазія не мае межаў...



Фота Наталлі БАГРАЦОВАЙ.

**Насця ТУЗІК разам са сваёй каралевай.**

Самымі папулярнымі сярод канкурсантаў былі вобразы Шчаўкунка, Жар-птушкі і Кармэн.

— Гэтыя лялькі зрабілі, бясспрэчна, нашы пастаянныя гледачы, — кажа Святлана Казюліна. — Конкурс «Навагодняя тэатральная лялька» праводзіцца ў межах адукацыйнага праекта «Вялікі тэатр — дзецям». Штомесяц мы бясплатна знаёмім нашу юную аўдыторыю з шэдэўрамі сусветнай класікі, распавядаем пра кампазітараў, музычныя інструменты. Прычым робім гэта ў інтэрактыўнай форме. Мне пашчасціла вырасці ў сям'і з цудоўнай традыцыяй. Штомесяц як мінімум адзін раз мы наведвалі нейкія ўстановы культуры: музей, цырк... Але ў тэатры оперы і балета бывалі значна часцей. Гэта і не дзіўна *(усміхаецца).* Мама нават за некалькі гадзін да таго, як мяне нарадзіць, глядзела «Лебядзінае возера» ў Марыінскім тэатры (я нарадзілася ў Санкт-Пецярбургу). Сёння разумею, што менавіта гэтая цудоўная сямейная традыцыя паўплывала на мой выбар прафесіі. Я вельмі хацела б, каб іншыя дзеткі прыходзілі ў наш тэатр як мага часцей разам з бацькамі, бабулямі і дзядулямі і адчувалі тут атмасферу свята. Менавіта, каб зацікавіць іх, тры гады таму і нарадзілася ідэя конкурсу на лепшую тэатральную сямейную ляльку. Нашы гледачы яго вельмі чакаюць. Той факт, што дзеці ўжо ў кастрычніку, калі мы яшчэ не аб'явілі конкурс, прыходзяць у тэатр, прыносяць свае цацкі, кажа сам за сябе. Калі летась было 10 намінацый, сёлета зрабілі 22. Асабліва кранальна было бачыць акуратна запакаваныя пасылкі, на якіх вялікімі дзіцячымі літарамі было выведзена: «Калі ласка, асцярожна!» Традыцыйна ўсе рукатворныя тэатральныя цацкі мы перададзім сталічнай дапаможнай школе-інтэрнату №10.



**Шчаўкунок Мішы КЛІМАВА.**



**Кармэн сям'і СІНКЭ.**

Нягледзячы на тое, што пераможцаў толькі чацвёра, ні адно дзіця не пайшло з тэатра без падарунка. Абсалютна ўсе ўдзельнікі атрымалі ад Дзеда Мароза і Снягуркі дыпломы і памятныя сувеніры. І дружна пайшлі глядзець разам са сваімі бацькамі казачны балет «Жар-птушка». «Вось сёння паглядзім «Жар-птушку», — выпадкова пачула ўрывак з размовы бабулі са сваімі двума ўнукамі, што разглядалі цацкі на ёлцы, — а потым на балет «Шчаўкунок» абавязкова вас звяджу...

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by*

# САКРЭТ ІДЭАЛЬНАГА БУКЕТА

## ЧАМУ ЖАНЧЫНЫ НЕ ЛЮБЯЦЬ ГВАЗДЗІКІ, А ЖОЎТЫ КОЛЕР ЗНОЎ У МОДЗЕ?

**У прафесіі фларыста ўсе бачаць толькі прыгожы бок — вынік. За кадрам жа заўсёды застаецца ўвесь працаёмкі працэс. Пра тонкасці прафесіі, моду на кветкі і стэрэатыпы расказвае фларыст Алеся ГАНЧАР.**

### КВЕТКАВАЯ МОДА

У фларыстыцы існуе свая мода. Так, напярэдадні зімовых святаў з кожным годам усё больш дамоў упрыгожваецца калляднымі вянкамі, усё больш офісаў афармляецца кветкавымі кампазіцыямі. Наогул, кветкі — абавязковы атрыбут кожнай важнай падзеі ў жыцці. Менавіта таму любы нестандартны стыльны падыход да афармлення цяпер у модзе. Напрыклад, вясельныя букеты зараз сталі больш вялікімі і пышнымі. У іх фларысты ўключаюць сукуленты, часам нават калючкі, або ствараюць монабукеты з аднаго віду кветак або раслін, часам з выкарыстаннем такога незвычайнага матэрыялу, як бавоўна.

— Новаўвядзенні ў фларыстыцы з'яўляюцца штодня, — прызнаецца Алеся, — бо ў працэсе творчасці пры стварэнні букета альбо кампазіцыі ўзнікае маса ідэй, выкарыстоўваецца нейкі сезонны матэрыял, які можна знайсці ў лесе, на полі і нават не звярнуць увагу, але ён стане той самай «разыначкай».



Фларыст Алеся ўпэўнена: у прыродзе няма дзвюх цалкам ідэнтычных кветак.

**Каб букет радаваў вас як мага даўжэй, кожны дзень мяняйце ваду ў вазе і падразайце сцёблы па дыяганалі на 45 градусаў.**

Традыцыйна беларускія жанчыны любяць ружы, цюльпаны, півоні. Але зараз асабліва папулярныя ранункулюсы, альстрамерыі, гартэнзія. Любімыя колеры ў букетах — ружова-фіялетавы, чырвоны. Ёсць і абсалютна беспройгрышнае спалучэнне, якое падыходзіць да любой нагоды і любому чалавеку. Гэта бела-зялёная гама: тандэм пяшчотных белых кветак і зеляніны.

Так, як і ва ўсім іншым, мода ў фларыстыцы цыклічная і адназначна вяртаецца. Магчыма, толькі ў іншай інтэрпрэтацыі і з падачай пад іншым вуглом.

### У КОЖНАГА СЕЗОНА — СВАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ

Букеты адрозніваюцца адзін ад аднаго ў залежнасці ад сезона. Напрыклад, зімой фларысты часцей за ўсё выбіраюць ігліцу, шышкі, палачкі карыцы, бавоўну і жалуды. Але часам спецыяльна імкнуцца вылучыць букет на фоне снегу, зрабіўшы яго яркім і цёплым. Для гэтага дадаюцца вінныя, залатыя адценні, якія спалучаюцца з шэрым лісцем і ягадамі.

Вясной букеты размалёўваюцца ў акварэльныя колеры, бо менавіта ў гэты перыяд прырода абуджаецца і нам так патрэбныя адценні неба, ружова-аранжавага світання, шчотнай зеляніны, першых кветак. Гэты сезон прыўносіць у букеты пастэльныя колеры: ружовыя, салатавыя, далікатна-блакітныя, далікатна-фіялетавыя, а таксама шмат легкадумных дэталяў — стужак, карункаў, пер'я.

Летам кветкавыя кампазіцыі становяцца ўсё больш яркімі і насычанымі. У гэты сезон абуджаецца асноўнае «фларыстычнае» жыццё — больш вяселляў і мерапрыемстваў на адкрытым паветры. Акрамя гэтага, мноства кветак, як нашых, так і прывазных, даступныя і радуюць сваёй раскошай.

Асабліва падабаюцца нявестам марскія букеты, якія робяць для тэматычных вяселляў з выкарыстаннем ракавінак, упрыгожаных караблікамі і бела-сінімі стужкамі. Не выходзіць з моды і «рустык» — стыль сельскіх вяселляў. Аднак прастата заўсёды зманлівая. Лічыцца, што чым прасцей выглядае дэкор, тым складаней яго стварыць.

Восеньскія кампазіцыі з кветак — адны з самых яркіх. Трава, лісце, ягады, гародніна і садавіна — усё гэта выглядае ў восеньскім букеце вельмі арганічна. Усе «ядомыя» адценні чырвонага, аранжавага, охры будуць да месца і створаць атмасферу ўтульнасці.

— Я вельмі люблю дадаваць у букеты натуральныя матэрыялы, — гаворыць Алеся. — Напрыклад, сабраныя на палях каласы. Мае любімыя стылі афармлення — гэта вясковы, рустыкальны і «боха». Ім уласцівыя прастата, лёгкасць, свабода і пры гэтым натуральнасць. У гэтых стылях дапушчальны толькі жывы матэрыял. Можна выкарыстоўваць і засушаны, але не штучны. Як і многім фларыстам, мне складана прыняць ідэю працы са штучнымі кветкамі, але пры ўзнікненні жадання падоўжыць жыццё кампазіцыі я з радасцю працую з сухацветамі.



Зараз нявесты ўсё часцей выбіраюць вялікія і пышныя букеты.

### СТЭРЭАТЫПЫ

— У фларыстыцы існуе шмат стэрэатыпаў. Вось, напрыклад, адзін з іх: жанчыны ўпарта не любяць гваздзікі. Лічаць іх несвяточнымі кветкамі. Хоць у букеце іх нават не пазнаюць і часам блытаюць з півонямі. Але гваздзікі могуць быць не толькі чырвонымі. Існуе вялікая колькасць адценняў ад снежна-белага, пяшчотна-ружовага да ярка-ружовага і фіялетавага. І пры гэтым гваздзікі — вельмі ўстойлівыя кветкі з неверагодна далікатным водарам. За ўсе гэтыя вартасці фларысты вельмі любяць працаваць з гваздзікамі і спадзяюцца, што з кожным годам аматараў гэтых кветак стане яшчэ больш.

**Ёсць абсалютна беспройгрышнае спалучэнне, якое падыходзіць да любой нагоды і любому чалавеку. Гэта бела-зялёная гама: тандэм пяшчотных белых кветак і зеляніны.**

Разам з тым усё больш нявест выбірае жыццярадасны жоўты для асноўнага колеру свайго вяселля і не звяртаюць увагі на стэрэатыпы. Бо і праўда: усе адценні лімона, лайма, апельсіна настройваюць толькі на пазітыўны і вясёлы лад і вельмі асвяжаюць букет або кампазіцыю.

— Выбар кветак для вясельнага букета вельмі індывідуальны і залежыць ад сезона, пераваг нявесты, каляровай гамы, бюджэту букета. Я думаю, што непажаданых кветак у любой кампазіцыі або букеце няма, галоўнае, каб яны падыходзілі ўладальніку. А для фларыста няма нічога цікавей, чым брацца за незвычайныя, арыгінальныя задумкі і выкарыстоўваць новыя сарты кветак.

### ЗІМОВАЯ КАМПАЗІЦЫЯ

Як прызнаецца Алеся, зімовую кампазіцыю для дома самастойна зрабіць вельмі лёгка. З адмысловых матэрыялаў спатрэбіцца задэкарыраваная ёмістасць — невялікае вядзерца альбо гаршчок, а таксама спецыяльная зялёная фларыстычная губка. Усё гэта можна знайсці ў спецыялізаваных крамах. А далей усё робіцца выключна па вашым жаданні. Акрамя галоўнага зімовага атрыбута, галінак елкі або хвоі, можна дадаць жывыя кветкі. А яшчэ галінкі елкі прыгожа выглядаюць разам з долькамі апельсіна, шышкамі, банцікамі і навагоднімі цацкамі.



Трава, лісце, ягады, гародніна і садавіна — усё гэта выглядае ў восеньскім букеце вельмі арганічна.

Для таго, каб кампазіцыя прастаяла даўжэй, змяшчаць кветкі і галінкі неабходна ў папярэдне падрэзаную па памеры фларыстычную губку, вымачаную ў вадзе і замацаваную ў ёмістасці такім чынам, каб сама губка была не бачна. Яе, дарэчы, можна задэкарыраваць мохам, шышкамі або яловымі лапкамі. Каб кампазіцыя выглядала натуральна, пажадана афармляць яе не больш чым у трох колерах.

— Я лічу, — прызнаецца фларыст, — што чым больш незвычайная кампазіцыя з кветак, тым цікавей яе разглядаць. Але ва ўсім абавязкова павінна быць гармонія і найлепшая якасць фларыста, як часта кажуць — уменне своечасова спыніцца. Тым не менш «разыначка», асноўная ідэя абавязкова павінны прысутнічаць у любой кампазіцыі, нават самай маленькай. Да кветак можна дадаць любую садавіну ці гародніну, галоўнае, каб гэта адпавядала задумцы букета. Заўсёды добра глядзяцца ў кампазіцыях шышкі, ягады, незвычайныя галінкі, кавалачкі кары, моху, бярозавыя спілоўкі. Галоўнае, каб у выніку кампазіцыя выглядала натуральна і цэласна.

### КАБ ПРАСТАЯЛІ ДАЎЖЭЙ

Калі набываеце кветкі, аддавайце перавагу тым, чые бутоны раскрыліся напалову. Гэта дасць ім магчымасць раскрыцца пасля. Важна таксама, каб кветкі захоўваліся ў спецыяльным халадзільніку, былі нядаўна прывезены і візуальна выглядалі свежымі.

Для таго, каб букет радаваў вас як мага даўжэй, кожны дзень мяняйце ваду ў вазе і падразайце сцёблы па дыяганалі на 45 градусаў. Гэта дасць магчымасць кветцы «піць» больш вады. Сутыкненне зрэзу сцябла з паветрам прыводзіць да закупорвання пор і таго, што вада перастае «сілкаваць» кветку, таму і неабходны свежы зрэз.



Каласкі ў букеце — гэта прастата, лёгкасць і свабода.

Акрамя таго, кветкі не любяць скразнякоў і рэзкай змены тэмпературы, таму абавязкова пры транспарціроўцы на холадзе «ўцяпляйце» іх, а пры дастаўцы дадому не стаўце адразу ў ваду: дайце прывыкнуць букету да цяпла.

У выпадку, калі вы купляеце кветкі, а не гатовы букет, абавязкова паабрывайце ўсё ніжняе лісце, каб яно не датыкалася да вады і не пачало загніваць.

Каб падоўжыць жыццё зрэзаных кветак у вазе, фларысты часам выкарыстоўваюць антысептыкі ў парашку.

### ПРА СКЛАДАНАСЦІ І ЛЮБІМЫЯ МОМАНТЫ ПРАФЕСІІ

— У фларыстыцы, — расказвае Алеся, — як і ў кожнай прафесіі, ёсць пэўныя складанасці. Напрыклад, калі ты не можаш даць заказчыку патрэбны сорт кветак, бо зараз не сезон. Асабліва гэта тычыцца рэдкіх сартоў. Спецыфіка працы з жывымі кветкамі таксама мае на ўвазе пэўныя ўмовы транспарціроўкі і захоўвання, а таксама догляду за імі. Фізічна гэта сапраўды нялёгкая праца. Аднак вынік, які звычайна пераўзыходзіць усе самыя смелыя чаканні,варты затрачаных сіл.

Мне больш за ўсё падабаецца магчымасць выказвання ідэі і стварэння вобраза праз кветкі. Складана знайсці больш дзіўны, непаўторны і шматгранны матэрыял для творчасці, — гаворыць дзяўчына. — Прырода ніколі не стварае двух аднолькавых людзей. Не існуе і дзвюх цалкам ідэнтычных кветак. Іх можна разглядаць бясконца, але ўсё роўна яны будуць рознымі.

Я люблю падбіраць колеравыя і кветкавыя спалучэнні, якія падыходзілі б пэўнаму чалавеку. Люблю адкрываць новыя сарты, спалучэнні колераў, спрабаваць новыя варыянты кампазіцый. Проста трымаць у руках кветкі — гэта ўжо велізарнае задавальненне для мяне. А самае каштоўнае — гэта бачыць шчаслівыя твары нявест, мець магчымасць сваімі рукамі парадаваць родных і блізкіх, стварыць нешта непаўторнае.

Ганна БАГІНО. bahino@zviazda.by

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1. Капитальное строение с инв.№220/С-15126, назначение – здание птичника №1, наименование – птичник №1, общей площадью 1304,9 кв.м с теплоузлом, стоимостью 67 680 белорусских рублей<br>Лот № 2. Капитальное строение с инв.№220/С-15158, назначение – здание птичника №2, наименование – птичник №2, общей площадью 1300,9 кв.м с теплогенератором, стоимостью 68 080 белорусских рублей<br>Лот № 3. Капитальное строение с инв.№220/С-15119, назначение – здание птичника №3, наименование – птичник №3, общей площадью 1104,3 кв.м с теплогенератором, стоимостью 57 120 белорусских рублей<br>Лот № 4. Капитальное строение с инв.№220/С-13360, назначение – здание птичника №4, наименование – птичник №4, общей площадью 1325,8 кв.м с калориферной, стоимостью 73 200 белорусских рублей<br>Лот № 5. Капитальное строение с инв.№220/С-15128, назначение – здание птичника №5, наименование – птичник №5, общей площадью 1953,5 кв.м со складом, стоимостью 100 800 белорусских рублей<br>Лот № 6. Капитальное строение с инв.№220/С-15125, назначение – здание птичника №6, наименование – птичник №6, общей площадью 1838,4 кв.м с теплогенератором, складом, стоимостью 93 440 белорусских рублей<br>Лот № 7. Капитальное строение с инв.№220/С-15858, назначение – здание птичника №8, наименование – птичник №8, общей площадью 1830,7 кв.м с пятью холодными пристройками, стоимостью 105 120 белорусских рублей<br>Лот № 8. Капитальное строение с инв.№220/С-13359, назначение – здание птичника №9, наименование – птичник №9, общей площадью 1715,5 кв.м, стоимостью 90 000 белорусских рублей |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Глубокская птицефабрика» (УНП 300019583) |
| Местонахождение (адрес) имущества | Глубокский район, д.Марцебылино, ул.Производственная, д.6-1,6-2,6,6-5,6-6,6-8,6-9 |
| Наличие обременений | нет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 27.01.2017 в 11.00 часов<br>г. Витебск, ул.Б.Хмельницкого,10/1, каб.1.4 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома.<br>210015, г. Витебск, ул.Б.Хмельницкого,10/1.<br>Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович, тел/факс. 8(0212)614018, 8(033)6879145 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в повторных торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО СБ «Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 15.00 часов 26.01.2017.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |

Судебный исполнитель
отдела принудительного исполнения
управления принудительного исполнения
главного управления юстиции
Витебского облисполкома А.А. Ильющенков
Тел./факс 80212614018, моб. тел.80336879145
Приемный день – пятница с 8:00 до 17:00, обед с 13:00 до 14:00, каб. 1.4

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1. Изолированное помещение с инв. №240/D-47129, общей площадью 1194,9 м кв., назначение – административное помещение, наименование – Административно-хозяйственное помещение, стоимостью 136 187,41 бел. рублей |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Оршаагропроммаш» (УНН 300051602) |
| Местонахождение (адрес) имущества | г.Орша, пер. Заводской 2-й, 23-1 |
| Наличие обременений | нет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 27.01.2017 в 10.00 часов<br>г. Витебск, ул.Б.Хмельницкого,10/1, каб.1.4 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210015, г. Витебск, ул.Б.Хмельницкого,10/1.<br>Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович, тел/факс. 8(0212)614018, 8(033)6879145 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в повторных торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО СБ «Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 15.00 часов 26.01.2017.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |

Судебный исполнитель
отдела принудительного исполнения
управления принудительного исполнения
главного управления юстиции
Витебского облисполкома А.А. Ильющенков
Тел./факс 80212614018, моб. тел.80336879145
Приемный день – пятница с 8:00 до 17:00, обед с 13:00 до 14:00, каб. 1.4

## УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ЦЕНТР МОДЫ»,

25.01.2017 состоится

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

по адресу: г. Минск, пр-т Победителей,1. Время начала собрания 15.00. Регистрация участников собрания будет проводиться с 14.00 до 14.45 25.01.2017 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 1, 2 этаж, каб.18.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**:
О создании и (или) участии ОАО «Центр Моды» в Ассоциации организаций швейной отрасли легкой промышленности.

Созыв внеочередного общего собрания акционеров осуществляется наблюдательным советом ОАО «Центр Моды» на основании собственной инициативы.

За 10 дней до проведения общего собрания проект решения собрания с приложением необходимых обоснований и пояснений будет выслан представителям государства и каждому акционеру, владеющему более 10% акций Общества. Указанные материалы будут доступны для ознакомления иным акционерам (их представителям) по месту нахождения Общества в течение 7 дней до проведения собрания (с 17.01.2017, пр-т Победителей, 1, каб. 21 с 10.00 до 12.00 и с 14.00 до 17.00), а также в день проведения собрания.

Для регистрации участник собрания предъявляет:
- акционер (физическое лицо) – документ, удостоверяющий личность;
- представитель акционера (физического лица) – доверенность от имени акционера и документ, удостоверяющий личность представителя;
- представитель акционера (юридического лица) – доверенность от имени юридического лица и документ, удостоверяющий личность;
- руководитель юридического лица, являющегося акционером общества, – документ, подтверждающий его полномочия на участие в собрании, и документ, удостоверяющий личность

УНП 100649747

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 26 января 2017 года проводит 1-й от 10 ноября 2016 года повторный открытый аукцион по продаже имущества

| Номера лотов | Наименование имущества | Год выпуска | Начальная цена торгов, бел.руб., | Сумма задатка, бел.руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль Фольксваген Каравелла регистрационный знак АК 6659-7 | 2007 | 8 620.48 | 862,05 |

**Адрес нахождения имущества: г. Минск, ул. Калиновского,8.**
Имущество, выставленное на аукцион, находится в республиканской собственности и хозяйственном ведении ГВТУП «Белспецвнештехника».
**Аукцион** состоится по адресу: г.Минск, ул.Казинца, д.2, 6-й этаж, **26 января 2017 г. в 11.00.**
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 часов 23 января 2017 года**.

**Победитель аукциона обязан:**
1. Заключить договор купли-продажи **26 января 2017г.**
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней, нерезиденты Республики Беларусь в течении **10** банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, обеспечение штрафа и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**. **Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**
Ранее опубликованное извещение в газете «Звязда» № 192 от 5 октября 2016 г.

## ОБЪЯВЛЕНИЕ
### о повторных торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1.<br>Основное стадо КРС – коровы, общим весом 1513 кг, стоимостью 2250,59 белорусских рублей. |
| Собственник (владелец) имущества | Открытое Акционерное Общество «Звенячи». |
| Местонахождение имущества | Толочинский р-н, д. Звенячи.<br>По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к хранителю имущества Пахомович Елене Владимировне, тел. 8 (029) 249-17-38 |
| Наличие обременений | Залог ОАО «Белагропромбанк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4<br>02 февраля 2017 года в 10.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210029, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, 10/1.<br>Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24.<br>Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15. |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 - Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 15.00 часов 01 февраля 2017 года.<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ
### о повторных торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот №1.<br>Капитальное строение с инв. № 250/С-13208 (корпус заводоуправления), расположенное по адресу: г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101, общей площадью 2807.00 кв.м, начальная стоимость лота 333600 белорусских рублей |
| Собственник (владелец) имущества | Открытое Акционерное Общество «Технолит Полоцк». |
| Местонахождение имущества | г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101.<br>По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к хранителю имущества Юркевичу Виталию Геннадьевичу (т.м. 80297117680) |
| Наличие обременений | Не имеется |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4<br>02 февраля 2017 года в 14.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210029, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, 10/1.<br>Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24.<br>Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 - Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 15.00 01 февраля 2017 года.<br>Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## Извещение о проведении первых и повторных открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г.Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.(0212) 42-61-62.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка (с учетом/до деноминации) |
|---|
| **Лот №1.** Земельный участок с кадастровым №221289203601000195, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Шапечинский с/с, п.Липовцы, ул.Северная, 22, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Условия аукциона:** приступить к занятию земельного участка не позднее одного года со дня проведения аукциона. **Нач. цена:** 2 576,08 руб. **Задаток:** 257,60 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314140153 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Шапечинский сельисполком) |
| **Лот №2.** Земельный участок с кадастровым № 221288500101000195, площадью 0,1268 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д.Андроновичи, У-3 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Условия аукциона:** приступить к занятию земельного участка в течение одного года со дня утверждения проектной документации на строительство капитального строения. **Нач. цена:** 5 801,52 руб. **Задаток:** 580,20 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314130147 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Туловский сельисполком) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 15.02.2017 в 16.00 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 12.01.2017 с 8.30 по 14.02.2017 до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение зем. участка. Размер начальной цены и задатка (с учетом/до деноминации) |
|---|
| **Лот №1.** Земельный участок с кадастровым №221285916601000095, площадью 0,1495 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д.Шилы, ул.Приозёрная, 43Б, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, водоохранная зона рек и водоёмов (оз.Сосно), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000В. **Условия аукциона:** приступить к занятию земельного участка не позднее одного года со дня утверждения проектной документации на строительство капитального строения. **Нач. цена:** 1 478,98 руб. **Задаток:** 147,90 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314090173 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Мазоловский сельисполком) |
| **Лот №2.** Земельный участок с кадастровым №221288109601000631, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д.Сокольники, ул.Тепличная, 27К, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (пруд), территории перспективного развития населённых пунктов. **Условия аукциона:** возместить в установленном порядке убытки, причиняемые нарушением функционирования мелиоративных сооружений в связи с изъятием 0,1500 га осушенных земель, в сумме 882 руб; приступить к занятию земельного участка не позднее одного года со дня проведения аукциона. **Нач. цена:** 7 407,64 руб. **Задаток:** 740,76 бел.руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314110125 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Октябрьский сельисполком) |
| **Лот №3.** Земельный участок с кадастровым №221288109601000632, площадью 0,1500 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д.Сокольники, ул.Тепличная, 27Д, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (пруд). **Условия аукциона:** возместить в установленном порядке убытки, причиняемые нарушением функционирования мелиоративных сооружений в связи с изъятием 0,1500 га осушенных земель, в сумме 882 руб; приступить к занятию земельного участка не позднее одного года со дня проведения аукциона. **Нач.цена:** 7407,64 руб. **Задаток:** 740,76 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314110125 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 795, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Октябрьский сельисполком) |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 30.01.2017 в 15.00 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 12.01.2017 с 8.30 по 27.01.2017 до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона (утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся); получить в отделе архитектуры и строительства Витебского районного исполнительного комитета техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно проектно-сметной документации; осуществить строительство в сроки, определенные ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт.тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

■ Спрэчны момант

# «ЧАМУ НАС НЕ ПРЫЗНАЮЦЬ ШМАТДЗЕТНЫМІ?»

## Бацькі не згодныя з рашэннем чыноўнікаў

**У сям'і Вольгі і Уладзіслава ШАРАПАВЫХ трое дзяцей. Васьмікласнікі Мікіта і Лёша (сын Вольгі ад першага шлюбу і сын Уладзіслава і яго першай жонкі адпаведна), маленькая Юля (агульнае дзіця). Летась, калі нарадзілася дачка, бацькі звярнуліся ў адміністрацыю раёна, каб атрымаць пасведчанне шматдзетнай сям'і. Але чыноўнікі адмовілі. Прычына — адсутнасць блізкага сваяцтва. «Якая розніца? — здзіўляецца Вольга, якая цяпер спрабуе аспрэчыць гэта рашэнне. — Мы аднолькава клапоцімся пра ўсіх дзяцей».**

### Некалькі трактовак аднаго закона

Сям'я Шарапавых жыве ў сталічным мікраёне Лошыца. Вольга, якая цяпер знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску (малодшай Юлі ўсяго восем месяцаў), сустракае нас у прасторнай кватэры і расказвае ўсю гісторыю па парадку.



Фота Надзеі БУЖАН.

У маі жанчына падала заяву ў адміністрацыю Ленінскага раёна Мінска аб выдачы пасведчання шматдзетнай сям'і. Сабрала таксама дакументы для налічэння сямейнага капіталу. Парадокс, але адкрыць рахунак для капіталу адміністрацыя дазволіла, а вось выпісаць пасведчанне адмовілася.

**«Я аднолькава займаюся выхаваннем абодвух хлопчыкаў: гатую для іх ежу, дапамагаю рабіць урокі. Усё як у звычайнай сям'і».**

— Спачатку думала: не дык не, напэўна, яны маюць рацыю. Але потым глядзела адну беларускую перадачу па тэлебачанні, там выступаў адвакат якраз па маім пытанні. І ён сказаў, што не важна, родныя дзеці ці не, галоўнае — што яны знаходзяцца на ўтрыманні ў адной сям'і. І я пачала «капацца» ў гэтай тэме, — расказвае Вольга.

Яна сама юрыст па адукацыі, таму хутка разабралася ў заканадаўстве. Так, у артыкуле 62 Кодэкса аб шлюбе і сям'і запісана, што шматдзетнай лічыцца сям'я, дзе на ўтрыманні і выхаванні знаходзяцца трое і больш непаўналетніх. Ні слова пра сваяцтва. Вольга званіла таксама ў тэрытарыяльныя цэнтры сацабслугоўвання насельніцтва іншых раёнаў, дзе толькі пацвердзілі: яна мае рацыю. І нават адзначылі, што ў іх у падобных выпадках сем'і атрымлівалі пасведчанне.

— Чаму тады адным выдаюць, а другім — не? — задаецца лагічным пытаннем мінчанка. — Трактуюць закон, як каму захочацца.

### «Мы не прэтэндуем на льготнае жыллё»

Вольга напісала скаргу ў Камітэт па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама. Адтуль прыйшоў адказ, што пытанне аб прызнанні сям'і шматдзетнай павінна вырашацца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі індывідуальна ў кожным канкрэтным выпадку. У сітуацыі Вольгі варта прыняць да ўвагі тое, што маці Лёшы памерла, а для дзяцей цяпер створаны добрыя ўмовы жыцця. Да таго ж у выпадку няяснасці прававога акта рашэнні павінны прымацца з максімальным улікам інтарэсаў зацікаўленых асоб.

Скаргу пераслалі ў адміністрацыю Ленінскага раёна. 28 лістапада Вольгу запрасілі на пасяджэнне. Настойвалі, каб яна ўсынавіла Лёшу, — тады не будзе ніякіх праблем.

На тым пасяджэнні кіраўнік адміністрацыі паабяцаў, што да канца тыдня прымуць рашэнне. Пазней жанчыне патэлефанавала дырэктар тэрытарыяльнага цэнтра Ленінскага раёна, сказала, што пасведчанне сям'я ўсё ж такі атрымае. Маўляў, ужо ўсе паперы падрыхтаваны, кіраўніку адміністрацыі засталося толькі подпіс паставіць. А праз колькі дзён зноў званок: пасведчанне вырашылі не выдаваць.

Ні ў школы, ні ў тэрытарыяльнага цэнтра нараканняў на сям'ю няма. У кожнага хлопчыка ёсць асобны пакой, а бацькі клапоцяцца аб іх здароўі і развіцці, рыхтуюць да самастойнага жыцця.

— У Мікіты шмат грамат па матэматыцы, фізіцы, шахматах. Ён прадстаўляў школу на рэспубліканскім конкурсе «100 ідэй для Беларусі», атрымаў прыз на конкурсе «Ратавальнікі вачыма дзяцей». Нам з мужам школа выдала грамату за выдатнае выхаванне, — паказвае Вольга ўзнагароды, каб пацвердзіць: у іх прыстойная сям'я.

Пасведчанне мінчанка хоча атрымаць, каб у школе не плаціць за харчаванне.

— У месяц сто рублёў ідзе на дваіх дзяцей, — падлічвае яна кошт сняданкаў. — Мы маглі б купіць на гэтыя грошы памперсы і дзіцячае харчаванне для малой. Цяпер муж адзін працуе, заробак невялікі, і цяжкавата жыць на дапамогу. Ні на які льготны крэдыт на жыллё мы не прэтэндуем. У нас сваіх 97 «квадратаў», нам і так па метражы хапае.

У снежні Вольга падала скаргу ў Мінгарвыканкам, спадзеючыся, што яе справу нарэшце перагледзяць. «Лічу, што нам адмовілі незаконна. Мае аргументы не прынялі да ўвагі».

**Ірына ДУДКА, намеснік старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама:**

***— Мы ведаем пра гэту сітуацыю і знаёмы з сям'ёй Шарапавых: дзеткі цудоўныя, бацькі добра спраўляюцца са сваімі абавязкамі. Рашэнне аб выдачы пасведчання шматдзетнай сям'і прымаецца мясцовымі органамі, у дадзеным выпадку адміністрацыяй Ленінскага раёна, але мы здзіўлены, што нашы рэкамендацыі аб станоўчым рашэнні на карысць бацькоў не прынялі да ўвагі. Нашы юрысты цяпер прапрацоўваюць гэта пытанне, падключылася Міністэрства працы і сацабароны. Гарадская ўлада дзейнічае ў інтарэсах сям'і, і мы будзем дабівацца таго, каб пасведчанне Шарапавым было выдадзена.***

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Фотаздымак з гісторыяй

# Усё залежыць ад тых, хто кіруе...

**Чарговы прызыў у беларускае войска ўскалыхнуў у памяці падзеі даўніх дзён... Калі ў 1960 годзе, у другой палове кастрычніка, я і мае аднагодкі маршам рухаліся ад ваенкамата да чыгуначнай станцыі Мёры для адпраўкі на тэрміновую службу ў рады Савецкай Арміі.**



**Прывядзенне тэхнікі сувязі ў парадак пасля вучэнняў.** ***Злева направа:*** **круціць рычаг яфрэйтар Лосеў Валянцін з Ульянаўскай вобласці, Дорашаў Пётр — сталявар з Данецка, я і Карпаў Валодзя — шафёр.**

Строй сённяшніх прызыўнікоў радуе вока сваім знешнім выглядам: на большасці спартыўныя касцюмы, акуратныя курткі. Мы ж апраналі тое, што маглі, дакладней, каб не было ўрону для сям'і, бо ўсё адно ў часці гэта знішчалася. Так, мой сябра Славамір надзеў кажушок, пашыты яму ў 9-м класе, а цяпер — рукавы па локаць, на грудзях петлі з вяровачак — не сыходзіўся. Мне бацька аддаў свой фрэнч з грубага даматканага сукна. І такая ці падобная «экіпіроўка» была ў большасці навабранцаў. Калі ў вайсковай часці, пасля лазні, нас абмундзіравалі, мы адзін аднаго не маглі пазнаць. Нам выдалі скураныя рамяні і ялавыя боты — прыкмета, што служыць давядзецца за мяжой.

Курс маладога байца праходзілі ў Івацэвіцкім раёне, у балоцістым лясным масіве Волька. Прысягу прымалі ў сціплай абстаноўцы. Бацькі і знаёмыя, як цяпер (ды як і я да сваіх дваіх сыноў), не прыязджалі. Пасля каранціну пагрузка ў таварняк Брэст—Варшава—Франкфурт-на-Одэры—Эрфурт. Я і пяць хлопцаў з Віцебска трапілі ў Асобны полк сувязі 62-й арміі маршала Чуйкова, які базіраваўся ў горадзе Веймар. Нас адразу прызначылі ў палкавую школу малодшых камандзіраў-спецыялістаў.

У палку аказаліся дзеці розных народаў Савецкага Саюза. «Дзедаўшчыны» мы не ведалі, субардынацыя з сяржантамі і афіцэрамі — і не больш таго. Ніколі не было сутычак ці непаразуменняў і на нацыянальнай глебе. Адным з самых блізкіх мне сяброў стаў Віталь Беўзюк з Вінніцкай вобласці. Дзяліліся ўсім, нават пісьмамі ад дзяўчат і сям'і, таму я лёгка асвоіў украінскую мову. Яшчэ яскравы прыклад: на практычных палявых занятках я, «зялёны» курсант, быў размеркаваны да радавога трэцяга года службы з Арменіі Геваркяна, які па-сапраўднаму быў для мяне «дзядзькам», як у старой расійскай арміі. Ара (так мы чамусьці называлі ўсіх каўказцаў) вучыў мяне хутка і дакладна рабіць злучэнні кабелю, дзе і як лягчэй зрабіць пераход лініі цераз дарогу, як маскіравацца... Прытым ноша — два тэлефонныя апараты ТАІ-43, чатыры шпулі лёгкага кабелю, аўтаматы, процівагазы, каскі — усё было падзелена пароўну. Пазней, у 70—80-я гады, даведаўшыся пра нестатутныя адносіны, «дзедаўшчыну» сярод салдат у Саюзе, я з удзячнасцю ўспамінаў свайго першага напарніка і тое, што «дзед» не ўзвальваў на мяне ўвесь рыштунак, як гэта рабілі пазней.



**Удзел у аглядзе мастацкай самадзейнасці: на акардэоне іграе Кароль Валерый з Мінска, злева Карачанскі Сяргей — кубанскі казак, пасярэдзіне — я.**

Салдат без песні — не салдат. Паступова арганізоўвалася самадзейнасць. А якая песня без баяна? Валера Кароль з Мінска іграў на акардэоне. Дамовіліся ўсёй школай з палучкі ў 10 нямецкіх марак скласціся па 3 і купіць акардэон. Мне (а я закончыў культпрасветвучылішча) было даручана кіраваць хорам, і мы на аглядзе занялі 1-е месца.

Вельмі адказным, гуманным, палітычна і культурна-адукаваным быў нампаліт часці падпалкоўнік Кавалёў. Апроч палітзаняткаў, лекцый, імкнуўся пашырыць кругагляд салдат, арганізаваў некалькі пазнавальных экскурсій. Асабліва ўдзячны мы яму за наведванне Дрэздэнскай карціннай галерэі. Справа склалася наступным чынам: пры падрыхтоўцы да запланаваных вучэнняў у Саксоніі, раён Дрэздэна, Кавалёў папярэдзіў, каб мы на ўсякі выпадак узялі парадное абмундзіраванне хоць праз аднаго. Калі надарыцца магчымасць, то звозіць у Дрэздэн. Так і атрымалася. Законнчыўшы сеансы сувязі, наш батальён атрымаў адпачынак. Для нас было выдзелена па 4 гадзіны на кожную групу для паездкі.

Можа, каму здасца, што служба ў нашым палку была суцэльным святам, знаёмствам з музеямі Германіі. Але гэта зусім не так. Па-першае, нашаму прызыву «пашчасціла» быць сведкамі рэвалюцыі на Кубе і ўзвядзення Берлінскай сцяны, а гэта — боегатоўнасць № 1, г.зн. адмена водпускаў, нават афіцэрам. У самыя гарачыя моманты нават спалі з аўтаматамі. А ўжо «паваяваць» давялося амаль на ўсіх палігонах былой ГДР. Служба патрабавала высокай фізічнай падрыхтоўкі. Тэхніка сувязі па сённяшніх мерках — каменны век. Шпуля цяжкага чатырохжыльнага кабелю (Т-194— 80 кг). Прыстасаванні: аўтамабіль ГАЗ-63 для падвозу і цялежка для размотвання. Задача майму лінейна-кабельнаму аддзяленню — даць кабельную лінію ад вузла сувязі да радыёперадатчыка, які звычайна размяшчаўся за 3-4 кіламетры ад вузла. Маскіроўка лініі — адна са складаных аперацый. Даводзілася працаваць і кіркай, і ломам, і, нібы малпам, палазіць па стройных, без ніжніх сукоў, буках, робячы пераходы праз асфальтаваныя, хоць і ў лесе, дарогі.

Мне пашанцавала служыць у такой часці, дзе былі узорны парадак. Старэйшыя афіцэры, начальнікі службаў амаль усе былі баявымі афіцэрамі і вельмі ўважліва, з дабрынёй адносіліся да салдат. Намеснік начальніка па тыле, падпалкоўнік Бірук «абражаў» салдат наступным чынам: «Піраты! (любімая абраза). Калі я ўбачу кінутую лусту хлеба ці будзеце недаедкам выцірацьстол, згнаю на губе». Але нікога ні разу не пакараў. Затое на сталах у сталовай летам стаялі графіны з хлебным квасам. Ён трымаў падсобную гаспадарку, і харчаванне было добрае.

Я ніколі не наракаў на службу, хоць траплялiся і нылкі: маўляў, тры гады выкідваюцца з жыцця. Лічу, што армія — гэта школа жыцця. Праўда, усё залежыць ад тых, хто кіруе.

**Былы сяржант, старшы лейтэнант запасу, настаўнік Альфрэд ТЫЧКО,**
*в. Ідолта, Мёрскі р-н.*

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Картачкі (не больш за тры) з невялічкай (!) гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

■ Беларусікі

# ПАМЯТАЙ СВАЕ КАРАНІ, УНУЧКА!

**Гэтую картачку мы атрымалі з далёкага Новасібірска. Менавіта там жыве Сонечка — дзяўчынка з «ільнянымі» валосікамі і блакітнымі вочкамі.**



«Побач з унучкай — дзядуля Саша ў світцы, — піша бабуля беларусачкі Людміла Шчаслівенка. — Сфатаграфавала я іх разам падчас святкавання сібірскімі беларусамі Каляд. Кашульку для Соні мы з Аляксандрам Сцяпанавічам прывезлі з Беларусі. Вянок — таксама з беларускай саломкі. Кажам, што гэта беларускае золата! Унучка ахвотна так адзяваецца на святы, бо ўсе ў сям'і носяць нацыянальныя касцюмы з задавальненнем. Ёсць у Сібіры беларусы! Акрамя таго, Соня ведае, што ў Беларусі самыя прыгожыя пеўнікі (апошні раз мы з дзедам прывезлі ў Новасібірск сімвал 2017 года, зроблены на Нёманскім шклозаводзе). І гарбатку п'ём з найлепшых кубачкаў (з добрушскага фарфору) у свеце! Яшчэ Соня ведае, што Мінск — найцудоўнейшы горад зямлі. Усміхаючыся ў аб'ектыў, яна замест «чыззз» заўсёды кажа «Мііінск». Унучку назвалі Соняй у гонар беларускай бабулі са Жлобіна. Унука ж — Ванечкам — у гонар майго таты, беларускага партызана».

***Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Дасылайце здымкі вашых дзетак і ўнукаў (з невялікім аповедам) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб зірнуўшы на фота, адразу ж можна было зразумець, што гэта «беларусік». Арыгінальнасць і творчы падыход вітаюцца! Аднаго з герояў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз.***

# ЗІМОВЫЯ ХВАРОБЫ

## Парады беларускамоўнага доктара

**Многія дзеткі ведаюць Андрэя ВІТУШКУ як «дзядзю ў белым халаце», які ў праграме «Дабраранак» дае карысныя парады мядзведзіку Топу... Многія бацькі — як дасведчанага анестэзіёлага-рэаніматолага, што працуе ў аддзяленні рэанімацыі нованароджаных у РНПЦ «Маці і дзіця». Летась Андрэй абараніў дысертацыю на беларускай мове пра неданошаных дзетак. У сезон ён ахвотна выступае з лекцыямі пра зімовыя хваробы. На адну з іх завітала карэспандэнт «Звязды». І занатавала самыя цікавыя пытанні і адказы на іх.**

**— Ці ёсць нейкія тэмпературныя абмежаванні, калі ўзімку лепш не выходзіць гуляць на вуліцу з маленькімі дзеткамі?**

— Для нашай геаграфічнай зоны ёсць рэкамендацыя: «мінус 5 градусаў на кожны месяц» (яна датычыцца дзяцей ва ўзросце да 6 месяцаў). Гэта значыць, з дзецьмі першага месяца жыцця можна гуляць пры тэмпературы не вышэй за 5 градусаў марозу, другога — 10, трэцяга — 15. Безумоўна, калі тэмпература паветра ўзнялася да мінус 20—25 градусаў, то варта падумаць пра мэтазгоднасць наогул выходзіць на вуліцу. Акрамя таго, трэба правільна апранаць дзяцей перад прагулкай, засцерагаць адкрытыя ўчасткі скуры — нос і шчокі. Ёсць адмысловыя крэмы, якія не ўтрымліваюць вады і дапамагаюць пазбегнуць абмаражэння далікатнай дзіцячай скуры і не дапусціць ускладненняў. Цяпер шмат рознай прадуманай зімовай вопраткі, таму не варта перативараць малога ў касманаўта, які з цяжкасцю можа паварушыцца.

**— Як зразумець, наколькі правільна вы апранулі дзіця?**

— Большасць матуль мацаюць нос ці вушы, але гэта няправільна. Трэба дакрануцца пальцамі да дзіцячай шыі. Калі яна гарачая і вільготная, значыць занадта цёпла апрануліся. Адпаведна, калі шыя халодная — трэба бегчы дадому і апранацца цяплей.

**— Што рабіць, калі ўсё ж такі атрымалі лёгкае абмаражэнне?**

— Як правіла, пачынаецца ўсё з таго, што нямеюць пальцы на руках і на нагах, мерзнуць нос і шчокі. Калі вы гэта адчуваеце, то трэба шукаць цёплае памяшканне: падземны пераход, краму, цырульню. Зайдзіце і пабудзьце там хоць 5 хвілін. Калі дабеглі дадому, спачатку трэба адагрэць рукі цяплом уласнага дыхання, а потым можна змясціць іх пад струмень цёплай вады. У гэтай сітуацыі дапушчальна папарыць ногі, папіць цёплай гарбаты. Да кожнай сітуацыі трэба падыходзіць індывідуальна. Так, напрыклад, дзецям з алергіяй супрацьпаказаныя зёлкі. Іх ужыванне стварае дадатковую нагрузку на імунітэт і правакуе абвастрэнне.

**— Ці варта расціраць абмарожаныя ўчасткі цела спіртам?**

— Не, бо калі ў вас халодныя рукі і вы на іх нанесяце яшчэ спірт, то ён пачне тут жа выпарвацца з паверхні скуры і забярэ апошняе цяпло.

**— Знаёмыя раілі выкарыстоўваць спірт ці воцат для таго, каб збіць тэмпературу...**

— Праводзіліся даследаванні: дзяцей пры павышанай тэмпературы абціралі спіртам і вадой. Дык эфект ад вады (пакаёвай тэмпературы) быў такі ж самы, як і ад спірту. Але пры гэтым апісаныя атручванні апошнім. Справа ў тым, што скура ў малых першага года жыцця тонкая. Праз яе спірт усмоктваўся і на выхадзе мелі «п'яных» дзяцей, якія паступалі ў аддзяленне рэанімацыі. Малых нельга расціраць спіртам. Тое ж самае тычыцца і воцату. Гарчычнікі дзецям да года таксама не раю ставіць, бо вельмі складана дазіраваць час, каб не атрымаць апёк.



**— Я выхавальніца дзіцячага садка. Што рабіць, калі дзеці пачынаюць чыхаць? Як самой не захварэць?**

— Раю зрабіць прышчэпку. Гэта дазваляе знізіць верагоднасць грыпу і іншых рэспіраторных вірусных інфекцый. Праўда, у студзені ўжо пазнавата. Калі зробіце прышчэпку цяпер, то яна можа нават нашкодзіць: вы рызыкуеце падхапіць грып ці іншую інфекцыю. Тым самым дадатковая нагрузка ўласны імунітэт.

**— Ці сапраўды эфектыўныя прышчэпкі ад грыпу?**

— Калі чакаць, што вы зрабілі прышчэпку і будзеце ўвесь сезон здаровымі (гэта значыць, у вас не будзе ні кашлю, ні насмарку), то гэта занадта завышанае чаканне. Механізм прышчэпкі ад грыпу ў тым, што яна бароніць менавіта ад гэтага захворвання. То-бок, што чалавек альбо не захварэе на грып, альбо калі захварэе, то пройдзе гэта ў больш лёгкай форме, без сур'ёзных ускладненняў. Прычым, каб быў эфект, прышчэпку трэба рабіць штогод.

**— А ці дапамагае аксалінавая мазь?**

— Вірусаў, якія выклікаюць рэспіраторныя вірусныя інфекцыі, каля 200. На некаторыя аксалін дзейнічае. Але на большасць — не. І ў вас ёсць велізарная верагоднасць сустрэцца менавіта з тым вірусам, ад якога не ўратуе аксалін.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

### ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД ВОСТРЫХ РЭСПІРАТОРНЫХ ІНФЕКЦЫЙ УЗІМКУ:

- ✓ **Зрабіць прышчэпку ад грыпу.**
- ✓ **Пазбягаць блізкага кантакту з хворым чалавекам** (Андрэй Вітушка раіць трымаць дыстанцыю паўтара метра).
- ✓ **Выконваць правілы этыкету пры чыханні і кашлі** (закрываць рот і нос аднаразовымі папяровымі сурвэткамі (калі няма сурвэтак — карыстаемся локцем, а не далонню), мыць рукі пасля чыхання і кашлю).
- ✓ **Выпрацаваць звычку не дакранацца бруднымі рукамі да твару.**
- ✓ **Часта мыць рукі вадой з мылам, а калі немагчыма — апрацоўваць іх антысептыкам.**
- ✓ **Рабіць вільготныя прыборкі на працы і дома з праціраннем паверхняў, да якіх дакранаешся.**
- ✓ **Заставацца дома пры першых сімптомах хваробы.**
- ✓ **Правільнае загартоўванне.** Гэта не купанне раз на год у палонцы на Вадохрышча, а сістэматычная трэніроўка арганізма для павышэння яго ўстойлівасці да нізкіх тэмператур (сон у прахалодным памяшканні, кантрасны душ, штодзённы шпацыр на свежым паветры).
- ✓ **Рухальная актыўнасць штодня, здаровае харчаванне, паўнавартасны сон, спакой і кантроль над стрэсам, пазітыўныя эмоцыі.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## Як вывесці плямы з дублёнкі, футра і пухавіка

***На жаль, ніхто не застрахаваны ад непрыемных выпадковасцяў, якія могуць прывесці да з'яўлення на прыгожай вопратцы плям. Але парады, прыведзеныя ніжэй, змогуць выручыць у многіх момантах.***

**1.** Сухі бруд з дублёнкі нескладана счысціць пры дапамозе сухой шчоткі з жорсткім шчаціннем. Апрацаванае такім чынам месца варта потым акуратна працерці вільготнай шчотачкай, змочанай у мыльным растворы.



**2.** Калі на дублёнцы з'явілася тлустая пляма, яе трэба пасыпаць манкай або крухмалам. Выкарыстоўваць у такіх выпадках соль ні ў якім разе нельга.

**3.** Сухія забруджванні можна выдаліць пры дапамозе звычайнай гумкі.

**4.** Пляму на дублёнцы ад малака, марожанага ці яйка можна проста прамыць чыстай вадой, пакуль яна не засохла.

**5.** Зашмальцаваныя кішэні, каўнер або адвароты рукавоў дублёнкі добра адчышчаюцца пры дапамозе сумесі зубнога парашку і нашатырнага спірту. Намачыце ў сумесі шчотачку і патрыце праблемныя месцы. Замест парашку можна таксама выкарыстоўваць крэйду.

**6.** Калі на футры з'явілася пляма ад салодкага напою, яе можна вывесці з дапамогай сурвэткі, змочанай у мыльнай пене. Пасля такой апрацоўкі пляму варта выцерці сухой анучай і павесіць вопратку падсохнуць на плечыках.

**7.** Плямы тлушчу з футра можна вывесці, карыстаючыся такім рэцэптам: чайную лыжку нашатырнага спірту змяшаць з 3 чайнымі лыжкамі солі і растварыць сумесь у палове літра цёплай вады. Нанесці раствор на мяккую анучку і пацерці месца забруджвання.

**8.** Засалены мех футра можна асвяжыць з дапамогай гарачага пшанічнага або жытняга вотруб'я. Яго проста трэба пасыпаць на вопратку і пацерці рукамі.

**9.** Малапрыкметныя плямы з пухавіка выдаліць любы мыйны сродак, нанесены на анучку. Дастаткова проста пацерці пляму, а затым пачысціць сухой анучай.

**10.** Тлустыя плямы з пухавіка лепш прыбіраць з дапамогай бензіну. Для гэтага трэба нанесці на анучку бензін, намачыць плямы, а потым пасыпаць іх содай або крэйдай. Праз пару хвілін проста стрэсці парашок.

**11.** Ёсць таксама ўніверсальны сродак, які можна ўжываць для барацьбы з любымі плямамі на пухавіках. Гэта сумесь вады, нашатырнага спірту і мыйнага сродку для посуду. Трэба змяшаць усе кампаненты, узбіць вадкасць, каб утварылася пена, нанесці гэтую пену на губку і намачыць ёй плямы на вопратцы.

**12.** Адчысціць пухавік ад рознага роду плям дапаможа шклоачышчальнік у спрэі. Яго проста трэба нанесці на забруджанае месца, а потым прыбраць рэшткі пены пры дапамозе чыстай сухой губкі або анучкі.

## Альтэрнатыва глінтвейну

*Глінтвейн, мабыць, самы папулярны напой, які саграває. Каб разнастаіць сваё саграбальнае меню, яго можна замяніць нядрэннымі альтэрнатывамі.*

### «Гарачы яблык»

*Калядны чэшскі напой*

***Спатрэбіцца:** апельсін — 1 шт., вада — 100 мл, гваздзіка — 7 шт., карыца — 1 палачка, перац духмяны — 7 шт., цукар — 1 ч. л., сок яблычны — 500 мл.*



Здымаем цэдру з паловы апельсіна. З мякаці выціскаем сок. У каструлю выліваем яблычны сок, ваду, кладзём карыцу, гваздзіку і перац. Даводзім да кіпення.

Дадаём цэдру і цукар. Трымаем на слабым агні каля 2 хвілін. Уліваем апельсінавы сок і знімаем з агню. Пераліваем напой у тэрмас ці пакідаем у каструлі, накрыўшы ручніком на 10 хвілін. Разліваем гарачым па кубках праз сіта і ўпрыгожваем яблыкам і апельсінам.

### Глег

*Традыцыйны скандынаўскі калядны і наогул зімовы напой*



***Спатрэбіцца:** брусні́чны або чарнічны сок — 500 мл, чырвонае віно — 750 мл, карыца — 3 палачкі, гваздзіка — 8—10 шт., кардамон — 1 ч. л., імбір і цукар — на смак.*

Пакладзіце вострыя прыправы ў сок і варыце каля дзесяці хвілін, потым працадзіце. Уліце ў напой віно і крыху падагрэйце. Дадайце цукар, разліце па шклянках і дадайце ў кожную крыху разынак і міндальных пялёсткаў.

### Гарачае піва

*Напой, традыцыйны для Скандынавіі, Прыбалтыкі і Польшчы*



***Спатрэбіцца:** яблык — 2—3 шт., цёмнае піва — 400 мл, імбір, мускатны арэх, цукар — на смак.*

Спячыце яблыкі ў духоўцы або мікрахвалёўцы, ачысціце і разатрыце ў пюрэ. Раскладзіце па шклянках. Нагрэйце піва да 70—80 градусаў, дадайце вострыя прыправы, цукар і старанна размяшайце. Напой гатовы.

*ЧАСАМ УСЁ, ШТО ТРЭБА ЗРАБІЦЬ, КАБ СУПАКОІЦЬ КАГОСЬЦІ, — ГЭТА НАГАДАЦЬ ЯМУ, ШТО ВЫ ПОБАЧ (Тувэ Янсан).*

**Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

■ Сталічныя хронікі

# З АГНЮ ДЫ Ў ПОЛЫМЯ

## Як у ХХ стагоддзі цярпелі за рэлігію... будынкі

**Храмы, саборы, цэрквы, касцёлы, базілікі, кірхі — незлічоная колькасць культавых збудаванняў, якія з'яўляюцца галоўнымі славутасцямі таго ці іншага месца. Уражвае не толькі іх прыгажосць, але і здольнасць выстаяць: усе захопнікі, каб пазбавіць народ духоўнай апоры, заўсёды імкнуліся разбурыць іх у першую чаргу. У Мінска — свая карта гонару, на якой магло б быць значна больш аб'ектаў, калі б не нягоды гісторыі. «Звязда» даведалася, якія архітэктурныя скарбы страціла сталіца ў мінулым стагоддзі, што сталася з намоленымі месцамі і якія сляды згубленай велічы яшчэ можна адшукаць у пейзажах сучаснага горада.**

### АД МАНАХАЎ — АФІЦЭРАМ. ПАСЛЯ — МУЗЫКАМ?

У час Вялікай Айчыннай вайны ні адзін сталічны храм не быў цалкам разбураны: усе пашкоджанні можна было ліквідаваць з дапамогай рэстаўрацыі. Аднак ліквідаваць вырашылі не разбурэнні, а самі, бескарысныя ў гэты перыяд з пункту гледжання прамога прызначэння, збудаванні.

Так, у 1950 годзе быў знішчаны касцёл святога Тамаша Аквінскага, які знаходзіўся каля сучаснага будынка Палаца Рэспублікі з боку вуліцы Энгельса і быў галоўным храмам кляштара дамініканцаў. Як расказаў экскурсавод Аляксей Завадскі, яго пабудавалі ў самым пачатку XVII стагоддзя — у 1605 годзе. Непадалёк, у вусці Свіслачы, знаходзілася застава, дзе сплачвалі так званы «капытковы збор» за права ўезду ў горад. На гэтыя падаткі і пабудавалі вытанчаны, прыгожы, але ў той жа час вельмі ўмацаваны касцёл. Бо, акрамя сваёй галоўнай функцыі, ён выконваў яшчэ і абарончую: таўшчыня сцен складала 3 метры, былі нават спраектаваны спецыяльныя байніцы для гармат. Касцёл уваходзіў у абарончы перыметр: замест гарадскіх сцен выкарыстоўваліся добра ўмацаваныя каменныя храмы, якія знаходзіліся ў розных канцах горада. І гэтая функцыя была зусім не фармальнай: пры даследаванні касцёла на яго тэрыторыі выявілі вялікую колькасць чалавечых парэшткаў, пашкоджаных халоднай і агнястрэльнай зброяй. У XIX стагоддзі дамініканцы за падтрымку паўстання 1831 года страцілі месца набажэнстваў і касцёл быў прыстасаваны пад афіцэрскі клуб.

Ужо ў савецкія часы, у 1926 годзе, будынак у стылі барока ўнеслі ў спіс гістарычных каштоўнасцяў. Менавіта таму за пашкоджанні, нанесеныя яму падчас вайны, былі выплачаны нямецкія рэпарацыі. Аднак на аднаўленне храма гэтыя грошы так і не пайшлі: змяніўся план горада, на Цэнтральнай (цяпер Кастрычніцкай) плошчы павінен быў з'явіцца манумент Сталіну, а касцёл, на думку праекціроўшчыкаў, быў не лепшым для яго фонам. Таму за адну ноч архітэктурны помнік знішчылі, а ўсяго праз некалькі гадоў таксама пад покрывам цемры прыбралі і постаць «правадыра народаў». На шчасце, цалкам ацалелі падземныя збудаванні касцёла, якія самі па сабе таксама з'яўляюцца каштоўнасцю. Пры ўзвядзенні Палаца Рэспублікі яны былі закансерваваны, так што пры жаданні храм можна аднавіць на тым жа месцы. Дарэчы, праект ужо існуе. Ён распрацаваны Грамадскім аб'яднаннем «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры». Адзін з варыянтаў — задзейнічаць яго пад свецкія мэты, у прыватнасці, як «базу» для Прэзідэнцкага сімфанічнага аркестра.

### ТУТЭЙШЫЯ: ІЎДЗЕІ І МУСУЛЬМАНЕ

Дарэчы, з'ява, калі на месцы разбуранага храма так і не ўзнікае новае збудаванне, даволі распаўсюджаная. Так, да гэтага часу пустуе тэрыторыя, якую раней займала Халодная сінагога: яна з'явілася ў Мінску ў канцы XVI стагоддзя і доўгі час лічылася самым старым мураваным будынкам у горадзе. У 1965 годзе яна была знішчана, засталіся толькі рэшткі падмурка пад зямлёй, бо нібыта замінала будаўніцтву новай магістралі — дублёра галоўнага праспекта, з той жа прычыны быў знесены і цэлы раён — старая Няміга.



Татарская мячэць.

Сінагога ў гатычным стылі атрымала такую назву з-за сваёй значнасці. Звычайна іўдзеі дзяліліся на прыходы па прафесійнай прыкмеце, але існавала некалькі галоўных сінагог, дзе ўсе збіраліся разам толькі падчас вялікіх свят. Халодная — была адной з іх: у астатні час яна не абагравалася, таму тэмпература тут была сапраўды нізкай. Усяго ж у пачатку XX стагоддзя на тэрыторыі Мінска было 83 сінагогі. Адной з самых цікавых з архітэктурнага пункту гледжання з'яўлялася харальная сінагога на цяперашняй вуліцы Валадарскага. Яе пабудавалі ў 1906 годзе ў нетыповым для Беларусі маўрытанскім стылі. Фармальна ў савецкі час яна не была знішчана, аднак цалкам страціла сваё рэлігійнае прызначэнне: спачатку тут размясціўся самы вялікі на той момант кінатэатр, а пасля — драматычны тэатр, які цяпер носіць імя М. Горкага. Як адзначыў Аляксей Завадскі, ад незвычайнага стылю зараз нічога не засталося, а вось аб праўдзівым прызначэнні будынка ўсё ж можна здагадацца: на гэта паказваюць тры характэрныя акны, размешчаныя на другім паверсе.

А вось татарам, якія, як і яўрэі, пасяліліся на тэрыторыі Беларусі па запрашэнні вялікага князя Вітаўта, доўгі час не дазвалялася будаваць мураваныя храмы. І таму першая мураваная мячэць з'явілася ў Мінску толькі ў пачатку XX стагоддзя — у 1901 годзе. Яна выстаяла ў вайну, але стала ахвярай новай гарадской забудовы: неабходна было ўладкаваць рэстаран каля гасцініцы «Юбілейная». Адноўлена мячэць толькі летась — праз паўстагоддзя: практычна ў тым жа выглядзе, толькі павялічаная ў 4 разы, аднак на новым месцы — па вуліцы Грыбаедава. Туды ж былі перанесены камяні, якія засталіся ад разбуранай «папярэдніцы».


Касцёл святога Тамаша Аквінскага.

### ГІСТОРЫЯ Ў РУІНАХ

На тэрыторыі Беларусі ўжываліся прадстаўнікі як розных рэлігій, так і розных хрысціянскіх канфесій. У сярэдзіне XIX стагоддзя насупраць цяперашняга ўніверсама «Цэнтральны» была пабудавана лютэранская кірха ў класічным стылі. Яна моцна пацярпела падчас вайны, і яе вырашылі не аднаўляць. Зноў успомнілі аб мінскіх лютэранах летась, калі падчас дарожных работ на вуліцы К. Лібкнехта знайшлі парэшткі з могілак раёна Нямецкай слабады, якія зраўнялі з зямлёй у 1970-я. Некаторы час гарадскія ўлады не маглі прыняць рашэнне, што рабіць з астанкамі, аднак пасля адвялі ім месца на Паўночных могілках, дзе цяпер усталяваны памятны знак.

Дарэчы, з могілкамі суседнічаў кляштар бенедыкцінак, які знаходзіўся там, дзе цяпер Генпракуратура і кінатэатр «Перамога». Калі некропаль быў зачынены ў канцы XVIII стагоддзя, то будынку кляштара прыйшлося «заснуць вечным сном» у 1960-я. У XVI стагоддзі на гэтым месцы размяшчаўся кальвінскі збор — першы пратэстанцкі храм Мінска. Адсюль пайшла і надоўга замацавалася і назва вуліцы — Зборавая, цяпер — Інтэрнацыянальная.

Яшчэ да вайны ў 1936 годзе была знішчана Казанская царква, якая знаходзілася на сучаснай плошчы Мяснікова. У народзе яна атрымала іншую назву — Чыгуначная, яе пабудавалі пры падтрымцы прадстаўнікоў гэтай транспартнай сферы. Гэта быў адзін з першых маштабных падрываў гістарычных будынкаў на тэрыторыі Беларусі, таму да яго правядзення рыхтаваліся грунтоўна: запрасілі спецыялістаў з Масквы і зладзілі «паказальны выступ» для кіраўніцтва рэспублікі, якое назірала за працэсам з балкона Дома ўрада. Тэрыторыя, якая вызвалілася, пустуе па сённяшні дзень, аднак убачыць царкву на свае вочы можна і цяпер: яе «блізняты» ў неавізантыйскім стылі ўпрыгожваюць вуліцы Вільні, Рыгі і Таліна.

А візітнай карткай Мінска «для сваіх» да гэтага часу застаюцца рэшткі Архірэйскага падворка. За Домам афіцэраў прытаіўся будынак былога царкоўна-гістарычнага музея, які адметны наяўнасцю дзвюх вежаў: праваслаўнага і каталіцкага тыпу. Комплекс з'явіўся ў Мінску ў пачатку XIX стагоддзя пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі і стварэння мясцовай епархіі. Пасля рэвалюцыі некаторы час тут размяшчаўся ўрад Беларусі. У 1934 годзе ў сувязі з узвядзеннем Дома афіцэраў падворак практычна цалкам быў знесены, аднак падмурак і некалькі сцен сталі асновай для новага збудавання.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*



Лютэранская кірха.




На Новы год ішлі дажджы,
Ды не было ад іх карысці.
Надвор'е, як, брат, ні кажы,
Ужо не тое, што калісьці.

Ультрапалярных маразоў
Раней вятрыска
не прыносіў.
Халодных, невядомых
слоў
Усё больш у метэапрагнозе.

Даўнейшых вёснаў
не відаць,
Вятры, аблокі не такія.
Але навошта наракаць —
Мы самі ўжо даўно не тыя...

Адно ад страты зберагli:
Ў нябёсах студзеньскіх,
нязменна,
Дзе лёс ні вёў нас
па зямлі —
Шукаем зорку Віфлеема.

# ДОМ, ДЗЕ АДАГРЭЮЦЦА СЭРЦЫ

**У Жабінцы адкрылі першы ў раёне дом сямейнага тыпу. Сюды пераехала сям'я Алены і Віктара Янушаў з пяцярымі дзецьмі ва ўзросце ад 8 да 14 гадоў. Наваселле адзначылі перад самымі Калядамі.**

Але прыёмныя дзеці з'явіліся ў гэтай сям'і даўно. Алена Віктараўна і Віктар Рыгоравіч выгадавалі абедзвюх сваіх дачок. Адна з іх ужо працуе настаўніцай, другая ва ўніверсітэце атрымлівае спецыяльнасць педагога-псіхолага. Дзяўчынка Саша з'явілася ў іх доме, як толькі пайшла ў першы клас, зараз Аляксандра вучыцца ў шостым. Потым узялі Руслана, цяпер яму 14 гадоў, затым — Юру. Такім чынам сям'я функцыянавала як прыёмная з 2010 года. Муж і жонка Янушы маюць свой дом. Але ў ім яны змаглі прыняць толькі траіх дзяцей. А вялікая сям'я стала магчымай з узвядзеннем новага двухпавярховага прасторнага дома. Надаўна іх сямейны калектыў вырас — яго папоўнілі Маша і Арцём.


Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

І ўжо навагоднюю ёлку прыбіралі ўсе разам у доме па вуліцы 17 Верасня. Каб свята ў гэтай хаце атрымалася цёплым і камфортным, пастараліся будаўнікі Жабінкаўскай ПМК-10. Яе начальнік Мікалай Шпакоўскі ўручыў навасёлам сімвалічны ключ.

Як звычайна і бывае, на наваселле прыехала шмат гасцей. Вядома, з падарункамі. Старшыня Брэсцкага абласнога Савета Сяргей Ашмянцаў падарыў сям'і два веласіпеды, старшыня Жабінкаўскага райвыканкама Дзмітрый Гарадзецкі — ноўтбук. Былі таксама прэзенты ад спонсараў, грамадскіх арганізацый. Адным словам, дзеці шмат чаго смачнага і цікавага знайшлі пад ёлкай на сямейным ранішніку, які дапамаглі правесці сапраўдныя Дзед Мароз са Снягуркай.

А дарослыя тым часам парадаваліся, што яшчэ некалькі хлопчыкаў і дзяўчынак, якія па розных прычынах засталіся без бацькоўскага клопату, знайшлі сямейнае цяпло. І як паведаміла Алена Януш, хутка ў доме сямейнага тыпу стане больш дзяцей. Месца тут хопіць усім.

Дарэчы, у адным з самых маленькіх раёнаў краіны — Жабінкаўскім — 15 дзяцей выхоўваецца ў прыёмных сем'ях, яшчэ 18 — у апякунскіх. І вось цяпер з'явіўся дом сямейнага тыпу. Усяго ў Брэсцкай вобласці пабудавана 45 такіх дамоў, дзе пражываюць 286 дзяцей.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

**по продаже права на заготовку и закупку виноградной улитки «Helix pomatia» на территории Каменецкого района**

| Предмет аукциона | Продавец недвижимого имущества | Промысловый запас виноградной улитки «Helix pomatia» / предельно допустимый объем изъятия | Начальная цена продажи предмета аукциона, базовых величин / рублей | Сумма задатка, базовых величин / рублей | Организатор аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| **Право на заготовку и закупку виноградной улитки «Helix pomatia» на территории Каменецкого района** | Каменецкий районный Совет депутатов | **11,5 тонн / 5,75 тонн** (в соответствии с заключением Национальной академии наук Беларуси) | **20/460** | **10/230** | Каменецкий районный исполнительный комитет, г. Каменец, ул. Брестская, 9 тел. (01631) 2 10 98, 2 34 06 |

**Аукцион состоится 17 февраля 2017 г. в 14.30 по адресу: г. Каменец, ул. Брестская, д.9 (4 этаж, зал заседаний).**
**Для участия в аукционе представляются:**
1. Заявление на участие в аукционе (с указанием на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать по результатам торгов).
2. Заверенная копия свидетельства о государственной регистрации.
3. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет Каменецкого районного исполнительного комитета 3604370241873, ЦБУ №115 *филиала №100 Брестского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК 150501246,УНН 200056317, ОКПО 04062400*. Срок внесения суммы задатка по 14 февраля 2017 г. включительно.
В торгах могут принимать участие юридические лица или индивидуальные предприниматели, либо их представители (при условии предоставления надлежаще оформленной доверенности).
Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.
Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона оплатить стоимость приобретенного предмета торгов.
Аукцион проводится в порядке, определенном главой $2^1$ Правил добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699 «Об утверждении Правил добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства».
Победитель аукциона осуществляет **возмещение затрат на организацию и проведение торгов.**
**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Каменец, ул. Брестская, д.9, каб. 206, с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по 14 февраля 2017 года включительно. Контактный телефон (801631) 23406**

# ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 26 января 2017 года на 1-м открытом аукционе проводит 10-й от 22.09.2016 года повторный открытый аукцион и 15-й от 27 декабря 2016 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел.руб.) | Сумма задатка (бел.руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 159 | Специальный автомобиль УРАЛ-375АМ с кузов-фургоном КБ1.375 в составе: Кузов-фургон КБ1.375 №12086 1985 г. 2 кат. Автошасси УРАЛ-375 АМ ш. 442107 дв. 512919 1985г. 3 кат. 2615 км | г.Барановичи в/ч 97047 | 7 200,00 | 720,00 |
| 161 | Специальный автомобиль УРАЛ-375АМ с кузов-фургоном КБ1.375 в составе: Кузов-фургон КБ1.375 №04126 1985 г. 2 кат. Автошасси УРАЛ-375 АМ ш. 436456 дв. 342910 1985г. 3 кат. 1100 км | г.Барановичи в/ч 97047 | 7 200,00 | 720,00 |
| 211 | Специальный автомобиль УРАЛ-375А с кузов-фургоном К.375 в составе: Кузов-фургон К-375 №02513 1982 г. 4 кат. Автошасси УРАЛ-375А ш. 371760 дв. 598983 1982г. 3 кат. 2494 км | г. Кричев в/ч 33190 | 5 000,00 | 500,00 |
| 212 | Специальный автомобиль УРАЛ-375А с кузов-фургоном К.375 в составе: Кузов-фургон К-375 №08216 1981 г. 4 кат. Автошасси УРАЛ-375А ш. 361008 дв. 493269 1981г. 3 кат. 1258 км | г. Кричев в/ч 33190 | 5 100,00 | 510,00 |

